© PDF: Kamunikat.org 2013

© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2013

ТОЛЬКІ У НАС!

TV

СПАДАРОЖНІКАВАЕ!
● БТ, РТР, Астанкіна, НТБ С.-Пецярбург, Польшча-1, Польшча-2.

Іронія лёсу: рэферэндум, найвышэйшы акт дэмакратыі, у нас – просты шлях да дыктатуры. Галоўнае зараз пытаньне: як дзейнічаць дэмакратычным арганізацыям?

– ст. 2

ЦІТОК ці ПОСАХАЎ ?

Пасьля зьняцьця з пасады старшыні гарвыканкаму Генрыха Крупенкі, Горадня ўжо больш тыдня застаецца бяз мэра. «Бацьку», зразумела, не да нас - Вярхоўны Савет спакою не дае.

Аднак грамадзяне, у якіх прысутнічае цяга да азартных гульняў, пачалі ўжо біцца аб заклад на меркаваных кандыдатаў. Галоўныя стаўкі робяцца на сёньняшняга намесьніка старшыні гарвыканкаму Цітка і на аднаго з галоўных ідэолагаў Прэзідэнта - Посахава.

НАДВОРЪЕ

14-15 верасьня па вобласьці будзе хмарна, часамі дажджы. 14-га - месцамі дажджы моцныя. Вецер паўднёвы з пераходам на паўночна-заходні, 9-14 м/с. 15 верасьня - парывамі да 15-20 м/с. Тэмпература паветра 14 верасьня ўначы - 8-13, удзень - 10-15 градусаў, 15 верасьня ўначы - 5-10, удзень - 8-13 градусаў цяпла.

ПАГОНЯ

ЗАСНАВАНА Ў 1920 г

ВЫХОДЗІЦЬ ПА ПЯТНІЦАХ

ГРАМАДЗКА-ПАЛІТЫЧНАЯ ГАЗЕТА

№ 37 (184) • 13 – 19 верасьня 1996 г. • Кошт свабодны

КАМІСІЯ РАЗЬБЯРЭЦЦА

У N 35 «ПАГОНЯ» пісала аб канфлікце паміж былымі работнікамі завода «Радыёпрыбор» і дырэктарам вытворчага аб'яднаньня «Радыёхваля» сп.Герасіменкам.

6 верасьня пастановай N 335 гарвыканкаму была створана камісія для правядзеньня праверкі сітуацыі на аб'яднаньні.

Д.К.

НЕМЦА СУДЗІЛІ ПРАВІЛЬНА?

Абласны суд разгледзеў у касацыйным парадку скаргу грамадзяніна Германіі Юргена Кляйна на прыгавор суду першай інстанцыі. Нагадваем, што пан Кляйн быў **асуджаны за кантрабанду зброі на тры гады пазбаўленьня волі з адтэрміноўкай прыгавору.**

Касацыйная інстанцыя пакінула прыгавор у сіле.

С.С.

І ХВАРОБЫ Ў ДАДАТАК

На гарадзенскіх прадпрыемствах усё часьцей хварэюць людзі. Праведзеная нядаўна гарвыканкамам праверка выявіла, што ўзровень захворваньняў з часовай стратай працаздольнасьці на заводзе такарных патронаў вырас на 30%, на «Белкардзе» - на 24%, на заводзе аўтаагрэгатаў - на 14%, на «Хімвалакне» і «Азоце» - адпаведна - на 10 і 6 працэнтаў. Пастаянна расьце колькасьць і прафесійных алергічных захворваньняў. Па іх колькасьці ў Горадні лідзіруюць прадзільна-ніткавае аб'яднаньне і камбінат будаўнічых матэрыялаў.

Віктар ЛЮДВІКОВІЧ.

ЖЫЦЬ БЯЗ ЦІСКУ

На кастрычнік у Горадні запланаваны месячнік па прафілактыцы гіпертанічнай хваробы.

У агульнай структуры захворваньняў, інваліднасьці і сьмяротнасьці ў вобласьці сардэчна-сасудзістыя хваробы займаюць вядучае месца. На працягу 1996-97 гадоў, згодна з зацьверджаным гарвыканкамам планам прафілактычных мерапрыемстваў, плануецца стварыць грамадзкія пункты вымярэньня ціску, для якіх закупіць дастатковую колькасьць неабходных апаратаў.

В.ДРЭМА.

ПАГОНЯ ВА ЎСІХ АДДЗЯЛЕНЬНЯХ СУВЯЗІ!

ПРАЦЯГВАЕЦЦА ПАДПІСКА

НА IV квартал 1996 г.

Падпісная цана "ПАГОНІ"
на 1 месяц – 8 тыс. руб.
на квартал – 24 тыс. руб.

Падпісны індэкс 63124.

АПОШНЯЯ СПРАВА «МАЎРАЎ»?

У мінулую суботу на першай старонцы рупара гарадзенскай «вертыкалі» «Гродзенскай праўды» зьявілася нататка «Ветераны требуют запрета «Пагоні»».

У ёй паведамлялася, што «гродненский областной совет организации ветеранов войны и труда, Вооруженных сил и правоохранительных органов» зьвярнуўся ў Дзяржкамдрук з просьбай «рассмотреть вопрос о запрещении выпуска газеты «Пагоня»». Газета, на думку аўтараў звароту, «систематически» «порочит» «честь и достоинство А.Лукашенко», «извращает происходящее в Белоруссии события». Паколькі «ПАГОНЯ», на думку адстаўных кадэбістаў і партакратаў, «стала рупором небольшой группы людей... противоречащей мнению большинства народов (а мы думалі, народ у нас адзін - В.Л.), она не имеет права на существование».

Публікацыя гэтага ліста (як заўсёды ў такіх выпадках, бяз подпісу) зьяўляецца чарговым сьведчаньнем таго, што на Беларусь вяртаюцца часы гнюсных даносаў, хлусьні, рабалепства перад «вождём» ды барацьбы з ворагамі народаў. У першыя шэрагі гэтага «идеологического» (лепш сказаць, «идиотического») боя кінулі людзей з досьведам - былых верных служкаў сталіншчыны і брэжнеўшчыны, якія калі не расстрэльвалі самі, то хлопалі ў далоні, калі чарговых «ворагаў» вялі ў Курапаты ці высылалі ў ГУЛАГ. Паводле задумы тых, хто ідзе за іх сьпінамі і скіроўвае рэшткі старэчай энергіі на разбурэньне, «маўры», перад тым, як ім у апошні раз абмыюць рукі, павінны зрабіць галоўную справу. А менавіта - пацягнуць за сабой у труну новых «ворагаў народу», у лік якіх ветэраны ўжо запісалі 13 тысячаў чытачоў «ПАГОНІ». Праз два месяцы гэтыя ж «маўры» прапануюць паставіць да сьценкі сотні тысяч тых, хто скажа «не» на прэзідэнцкім рэферэндуме. Дзеля стабілізацыі - не шкада. Вось толькі каб дзеці пасьля не праклялі. Не, не за «ПАГОНЮ» - за свае скалечаныя лёсы.

КРАЙНІМІ АКАЗАЛІСЯ ДЗЕЦІ...

УМЯШАЛЬНІЦТВА ПРЭЗІДЭНТА Ў КАНФЛІКТ ВАКОЛ ГАРАДЗЕНСКАГА ЛІЦЭЯ N 1 НЕ ПРЫНЕСЛА ЗАДАВАЛЬНЕНЬНЯ НІКОМУ, АКРАМЯ ЧЫНОЎНІКАЎ

Прэзідэнт зьняў мэра, запалохаў гарадзенскую «вертыкаль».



Дзеці, пераведзеныя ў розныя школы, у ліцэй практычна не вярнуліся. Іх бацькі так і не зразумелі, чаму ва ўказе дазволена вярнуцца толькі вучням 2-4 класаў, а ня ўсім вучням даліцэйнага ўзросту. Гэтую праблему яны абмяркоўвалі на сустрэчы 9 верасьня з загадчыцай гарана Л.Папянюк.

Карэспандэнта «ПАГОНІ» ўлады на гэтую сустрэчу не пусьцілі («Ну, давайце, зараз паклічам «Звязду», «Советскую Белоруссию» і іншых» У.Гаўрун.) Аднак нам вядома, што гэтая група бацькоў лічыць: іх рукамі адны чыноўнікі разабраліся з іншымі.

Бацькі дзяцей з усяго гораду, якія здалі экзамены і паступілі ў ліцэй, таксама стварылі ініцыятыўную групу. Яны накіравалі Прэзідэнту ліст з подпісамі больш як 200 чалавек. У лісьце патрабуецца вярнуць былога дырэктара Л.Шостку. Яны ня могуць даведацца, у чым яе віна. Даведкі па выніках праверкі нідзе не знайсьці. Бацькі цытуюць выказваньне аднаго з членаў камісіі Савету Бясьпекі: «Я - чалавек вайсковы. Мая справа - далажыць». Кампетэнцыя «ваенных» у пытаньнях адукацыі народу выклікае ў іх вялікі скепсіс. Сярод бацькоў ліцэістаў камісія шукала «новых беларусаў», каб потым вывесьці іх працэнт у параўнаньні з астатнімі. Навошта камісія ўзяла на ўзбраеньне метады пралетарскай дыктатуры і распальваньня сацыяльнай розьні - пра гэта ведае толькі яна сама (працэнт - галоўны паказьнік ліцэйнага скандалу - аказаўся невялікім).

Такім чынам, свае задачы выканалі тыя, хто хацеў зарабіць палітычны капітал. «Крайнімі» ў гэтай сітуацыі аказаліся дзеці.

Сяргей САМАСЕЙ.

«С НАШИМ АТАМАНОМ НЕ СОСКУЧИМСЯ СЛУЖИТЬ»

Калісьці на тэрыторыі былога Вялікага княства Літоўскага з гэткай вось песьняй (глядзі загаловак) на тачанцы насіўся бацька Махно. Пасьля чаго ён у Парыжы, у эміграцыі, на таксі езьдзіў ва ўніверсітэт на лекцыі па сусьветнай культуры. Ах, калі б атаманы (бацькі, правадыры, фюрэры, прэзідэнты) наведвалі лекцыі да таго, а не пасьля!

Тое, што начальства рыхтуецца да прэзідэнцкага рэферэндуму, - не сакрэт. Але ж большасьці насельніцтва невядома, як яно рыхтуецца. Зараз мы гэты прабел запоўнім.

Адзін з тых, хто рыхтуе рэферэндум на абласным узроўні, таварыш М.Прысада, сказаў:

- Дагэтуль прыходзіў журналіст, распытваў мясцовую ўладу аб тым ды іншым, і друкаваў. Мы вырашылі абыйсьціся без пасярэдніка. У аблвыканкаме, райвыканкамах створаны інфармацыйныя групы, якія будуць непасрэдна сустракацца з працоўнымі і даносіць да іх правільныя думкі...

Ну? А што я казаў? З такім атаманам (пардон, прэзідэнтам) чыноўнік «не соскучится служить». Як гэта ў раёне група з 2-3 чалавек «данясе да народу» тое, што, будзем шчырыя, з цяжкасьцю даносілі тысячныя наклады газетаў?

Мікалай Яфімавіч асабліва падкрэсьліў такую хібу: дагэтуль у вертыкалі не было сьпецыялістаў, якія могуць працаваць з моладдзю і вернікамі! Гэта дакладна. А адкуль зараз такія сьпецыялісты ўзяліся? А тыя самыя, што «курыруюць сацыяльную сферу». Вельмі зразумела: людзі занепакоеныя нявыплатай зарплаты, а ім кужуць: «Галасуй за прэзідэнта!» У Кіеве - тое, а ў агародзе - гэтае.

Ужо створаны камітэт: старшыня - Калацэй, намесьнікі Бірукова, Амелька, члены Шылконь, Багіна, Баламут... Народ павінен ведаць сваіх. Якія абяруць 650 дэлегатаў з вобласьці на «усебеларускі кангрэс». А ў Слоніме ўжо абралі траіх «на альтэрнатыўнай аснове».

Альтэрнатыўнай чаму?

Лявон ХРАПТОВІЧ.

ПАРАДАК НА ПАМЕЖНЫМ ПЕРАХОДЗЕ ПОЛЬСКАЯ ПАЛІЦЫЯ БУДЗЕ НАВОДЗІЦЬ «ГАРАЧЫМ ЖАЛЕЗАМ»

Два службоўцы беластоцкай паліцыі былі затрыманыя за атрыманьне хабару на памежным пераходзе Кузьніца-Брузгі. Разам з імі затрыманы два расейцы і цывільны жыхар Беластоку, які дапамагаў паліцэйскім прадаваць квіткі на нечарговы праезд праз мяжу.

«ПАГОНЯ» пісала пра хабарніцтва і штучна створаныя перашкоды на польскім баку пераходу для дробных турыстаў-гандляроў. І хаця першай рэакцыяй паліцэйскіх камісараў была крытыка нашага матэрыялу, у далейшым, пад узьдзеяньнем сабраных Беларускім консульствам у Беластоку і самімі грмадзянамі сьведчаньняў, польская паліцыя аказалася ў стане заняцца навядзеньнем парадку ў сваіх шэрагах. Інсьпектар Т.Сэрватка з Беластоку заявіў, што правапарушэньні сярод падначаленых будзе «выводзіць гарачым жалезам», паведамляе беластоцкая газета «Кур'ер Падляскі».

С.С.

«БАЦЬКА» ЗНОЎ СХЛУСІЎ?

Сьцьвярджэньні Лукашэнкі аб тым, што Расея будзе фінансаваць ахову беларускіх межаў, мякка кажучы, зьдзівілі кіраўніцтва Федэральнай памежнай службы Расейскай Федэрацыі. На самой справе ў верасьні 1995 году была падпісана міжурадавая дамова, якая прадугледжвае фінансаваньне Расеяй 50% выдаткаў на ўладкаваньне і абсталяваньне зьнешняй мяжы Беларусі з Летувой і Латвіяй. Ні аб польскай частцы беларускай мяжы, ні аб грашовым утрыманьні беларускіх памежнікаў за кошт расейскага бюджэту, як паведаміў Рыгоравіч, у дамове нічога не гаворыцца. Больш таго, як высьветлілася, нават цяжар прадугледжаных 50% выдаткаў для Расеі пакуль непасільны.

На думку каментатараў Грамадзкага Расейскага тэлебачаньня, Масква сама стварыла для сябе складанае становішча. Яна дазволіла зрабіць вакол нядаўняга візіту беларускага Прэзідэнта ў Расею заслону таямнічасьці. Ніхто добра ня ведае, з кім і аб чым канкрэтна мог дамаўляцца Аляксандр Лукашэнка, які «інкогніта» наведаў «белокаменную» напрыканцы мінулага тыдня.

ПАЛЁГКА МЕДЫКАМ І ХВОРЫМ

Днямі ў Горадню павінна паступіць чарговая гуманітарная дапамога з Францыі.

Ячшчэ ў ліпені па даручэньні французскага Чырвонага крыжа грамадзякая арганізацыя Activitede Detente et d'Animation de le Jennesse з Бакамп-Ліны даставіла на адрас «Карытас» у Горадні медыкаменты і медыцынскае абсталяваньне. Яно было перададзена анкалагічнаму аддзяленьню абласнога шпіталя. Чарговы гуманітарны груз таксама разыйдзецца па медычных установах горада.

В.АНІМУЦКІ.

РУХ ЦЯЖКАВАГАВЫХ ГРУЗАВІКОЎ БУДЗЕ ЗАБАРОНЕНЫ

Кіраўнікам прадпрыемстваў, арганізацый і гаспадарак, прыватным асобам, якія маюць грузавыя аўтамабілі з прычэпамі агульнай масай звыш 16 тон, ня варта планаваць напярэхдадні 1 і 11 лістапада, 25 і 26 сьнежня бягучага году, а таксама 11 студзеня 1997 году іх паездкі ў Польшчу.

Міністэрствам транспарту і марской гаспадаркі Рэспублікі Польшча прынята рашэньне аб забароне ў названыя сьвяточныя дні руху гэтых транспартных сродкаў па дарогах краіны. Забарона ўступае ў сілу з 18.00 гадзін напярэдадні і будзе дзейнічаць да 0.00 гадзін наступных сутак, таму ў памянёныя дні пропуск гэтага транспарту польскім бокам на мяжы ажыцьцяўляцца ня будзе.

А.ДУК,
інсьпектар ДАІ УУС.

© PDF: Kamunikat.org 2013

© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2013

© PDF: Kamunikat.org 2013
© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2013

ПАЛІТЫЧНАЯ СЦЭНА

ФРОНТ УДЗЕЛУ Ў ВЫБАРАХ НЯ ПРЫМЕ?

Асноўнае пытаньне, якое разглядаў Сойм Беларускага Народнага Фронту «Адраджэньне» 7 верасьня 1996 году - удзел ці няўдзел у рэферэндуме і выбарах. Яно выклікала значны раскід меркаваньняў.

«Сваім рашэньнем (аб няўдзеле) мы падкрэсьліваем, што ні свабодны рэферэндум, ні свабодныя выбары ў гэтым грамадзтве немагчымыя», - сьцьвярджаў старшыня БНФ Лявон Баршчэўскі.

«Калі мы адмовімся ад удзелу ў выбарах, мы страцім увесь свой электарат», - даводзіў намесьнік Л.Баршчэўскага Юры Хадыка.

«Мы павінны пакінуць за сабой свабоду манеўра», - прапаноўваў яшчэ адзін намесьнік старшыні Станіслаў Гусак.

«Трэба даць свабоду выбару суполкам», - казаў сябра Сойму Алег Трусаў.

Нягледзячы на разыходжаньне думак, Сойм вызначыўся ў тым, што БНФ вядзе актыўную тлумачальную працу супраць пытаньняў рэферэндуму, але сам удзелу ў рэферэндуме і выбарах не прымае. Разам з тым Сойм пакінуў за сабой права ў выпадку зьмены сітуацыі ў краіне перагледзець сваю пазіцыю.

Адно зразумела пэўна: кантроль за ходам рэферэндуму актывісты Фронту наладзяць самы пільны.

Станіслаў СУДНІК.

Пра становішча ў краіне

Ухвала Сойму БНФ «Адраджэньне»

Прэзідэнт Лукашэнка надалей працягвае катастрафічную для краіны палітыку ўмацаваньня сваёй *аднаасобнай дыктатарскай улады*, топча Канстытуцыю і законы дзяржавы, разгортвае тэрор супраць апазыцыі. Правы чалавека ператвараюцца ў нішто. Душыцца незалежная прэса. Але ўсё больш людзей усьведамляе маштабы немінучай катастрофы і імкнецца прадухіліць яе. Выйсьце, даўно прапанаванае Народным Фронтам, — неадкладнае адхіленьне ад улады (імпічмэнт) прэзыдэнта Лукашэнкі. Дзеля паскарэньня імпічменту Народны Фронт увайшоў у паразуменьне з кіраўнікамі асноўных парляманцкіх пар-тыяў краіны і выкарыстаў увесь свой уплыў і досьвед, каб ініцыяваць працэс выратавальнага для Беларусі зьняцьця Лукашэнкі з пасады.

На жаль, Вярхоўны Савет, дзе няма прадстаўнікоў БНФ, не праявіў дастаткова наважнасьці. Шмат якія дэпутаты паддаліся сілавому ўціску А.Лукашэнкі. Яны ня толькі рэальна не распачалі працэдуру імпічменту, але і пагадзіліся праводзіць прэзыдэнцкі рэфэрэндум, чым фактычна падпісалі прысуд Вярхоўнаму Савету.

БНФ «Адраджэньне» заяўляе пратэст супраць нахабнага ўціску незалежных сродкаў інфармацыі краіны, супраць закрыцьця пад надуманай прычынай Радыё 101,2 і рэпрэсіўнага арышту рахункаў не-залежных газэт. Такім чынам адбываецца падрыхтоўка «рэфэрэндуму» ў гітлераўскім духу, калі людзі пазбаўленыя магчымасьці пачуць альтэрнатыўны пункт гледжаньня, калі ідуць крымінальныя працэсы над лідэрамі апазыцыі, калі міжнародна прызнана, што ў Беларусі пануе антыдэмакратычны рэжым. Народны Фронт ня лічыць магчымым для сябе ў гэтай сытуацыі ўдзельнічаць у кампаніі выбараў і рэфэрэндуму. БНФ працягвае масавую арганізацыйную і растлумачальную працу, скіраваную на *адхіленьне Лукашэнкі ад улады і абарону* незалежнасьці краіны, арганізоўвае кантроль на рэфэрэндуме і выбарах. У выпадку, калі Вярхоўны Савет у бліжэйшы час даможацца стварэньня дэмакратычных умоў для правядзеньня выбараў і рэфэрэндуму, Сойм БНФ пакідае за сабой магчымасьць зьмяніць гэтае пастанову.

7 верасьня 1996 г.
г.Менск

А МЫ Ў АДКАЗ НА ВАШ КАНГРЭС ЗЬБЯРЭМ БОЛЬШ САЛІДНЫ

На пасяджэньні «круглага стала» беларускіх палітычных партый і грамадзкіх арганізацый 9 верасьня была створана ініцыятыўная група па правядзеньні ўсебеларускага кангрэсу «У абарону Канстытуцыі, супраць дыктатуры».

Кангрэс плануецца склікаць 26 кастрычніка. Ініцыятыўную групу ўзначаліў экс-міністр Унутраных спраў РБ Юры Захаранка. Ён адзначыў, што зброя, якую плануе выкарыстаць Лукашэнка, можа павярнуцца супраць прэзідэнта.

ЗВАРОТ ДА ЎСІХ БЕЛАРУСКІХ І ЗАМЕЖНЫХ СМІ

прынялі на сваім пасяджэньні 6 верасьня ўдзельнікі «круглага стала» беларускіх палітыкаў у Менску.

У звароце, у прыватнасьці, гаворыцца, што Аляксандр Лукашэнка абвясьціў аб намеры правядзеньня рэферэндуму з мэтай пазьбегнуць адказнасьці за правалы ў эканоміцы, за парушэньне Канстытуцыі і законаў Беларусі. Аўтары звароту лічаць: «У сувязі з прапагандысцкім забесьпячэньнем рэферэндуму прэзідэнцкая адміністрацыя прывяла беларускае грамадзтва да стану «халоднай грамадзянскай вайны». Ідэалагічная апрацоўка, маніпуляцыя грамадзкай думкай і проста правакацыі ўзьведзеныя ў ранг афіцыйнай плітыкі».

Прадстаўнікі беларускіх партый зьвяртаюцца з заклікам да беларускіх журналістаў забясьпечыць права грамадзян на свабоднае выказваньне розных думак. А да замежных СМІ «часьцей і падрабязьней асьвятляць падзеі, якія адбываюцца ў Рэспубліцы Беларусь, і інфармаваць сусьветную грамадзкасьць аб рэальным становішчы ў Беларусі».

Д.К.

ЧАГО Ж ЯНЫ ХОЧУЦЬ? - СВАБОДЫ!

Нягледзячы на забарону гарадзкімі ўладамі сьвяточнага шэсьця ў гонар Дня Беларускай Вайсковай Славы, 8 верасьня каля 15.00 на Савецкай вуліцы пачалі зьбірацца людзі. Арганізатарам сьвята прыйшлося разгарнуць сьцягі і павесьці людзей арганізаванай калонай да Каложскай царквы, дзе павінен быў адбыцца дазволены мітынг.

Па дарозе пад бел-чырвона-белыя сьцягі станавілася ўсё большая колькасьць людзей. Калона падыйшла да помніка князя Вітаўта. Гісторык Алесь Краўцэвіч расказаў прысутным пра выключную ролю Вітаўта ў беларускай гісторыі. Пасьля ўскладаньня кветак да помніка, людзі пайшлі да Каложы.

Там, каля знака «Пагоня на Грунвальд» адбыўся мітынг. На ім выступілі прадстаўнікі дэмакратычных партый Горадні. Гучалі ня толькі словы падзякі продкам, якія 482 гады таму абаранілі Бацькаўшчыну ад маскоўскай дэспатыі. Людзі выказвалі таксама заклапочанасьць небясьпекай узьнікненьня дыктатуры на Беларусі. Таму весялосьці не адчувалася.

Настрой людзей ўзьняўся пад час канцэрту, які адбыўся пасьля мітынгу. У ім узялі ўдзел дзіцячы ансамбль «Дударыкі», барды Ірына Мамуль і Віктар Шалкевіч. Натальля Адонкіна прачытала сатырычныя вершы.

Пасьля заканчэньня імпрэзы да групы маладых хлопцаў, якія вярталі ся да хаты пад бел-чырвона-белымі сьцягамі падыйшла сталая кабета і запыталася: «Чаго ж вы хочаце?» «Свабоды!» - прагучаў адказ.

На пачатку стагоддзя беларусы хацелі «людзьмі звацца». Зараз людзі патрабуюць Свабоды.

Дз.КІСЕЛЬ.

ЦІ АДВАЮЮЦЬ ДЭПУТАТЫ МЭРА ?

Дэпутаты Гарадзенскага гарсавета А.Гаркоў, В.Чычагоў, Т.Маліноўская зьвярнуліся з зваротам да Старшыні Савету Ф.Гудзея з нагоды Указа Прэзідэнта аб зьняцьці з пасады мэра Горадні Г.Крупенкі. «Перакананыя, што адхіленьне ад пасады мэра ў палітычна стабільным горадзе было выклікана тым, што Прэзідэнта ўвяло ў зман яго бліжэйшае атачэньне», - гаворыцца ў звароце. «Дадзенае рашэньне зьяўляецца памылковым і ня служыць мэтам кансалідацыі грамадзтва і стабілізацыі палітычнай абстаноўкі, пра якія казаў і кажа Прэзідэнт народу», -працягваюць дэпутаты.

Паколькі пры звальненьні мэра, які зьяўляецца дэпутатам гарсавету, парушаны шэраг законаў, дэпутаты запатрабавалі ад Прэзідыуму гарсавету тэрміновага скліканьня нечарговай сесіі і вынясеньня гэтага пытаньня на яе разгляд.

5 верасьня адбылося паседжаньне Прэзідыуму гарсавету Горадні. На ім быў разгледжаны зварот дэпутатаў. Дзевяць членаў прэзідыуму галасавалі супраць скліканьня нечарговай сесіі і толькі адзін - за (дэпутат В.Чычагоў).

Дэпутаты В.Чычагоў, Т.Маліноўская, Б.Падольны, А.Гаркоў, П.Жураў падрыхтавалі новую заяву з намерам правесьці *пазачарговую сесію гарсавету*, бо рашэньне прэзідыуму не адпавядае арт.14 Закона аб мясцовым кіраваньні і самакіраваньні і іншых нарматыўным актам. Пад ім прапануецца падпісацца ўсім дэпутатам гарсавету, якія падтрымваюць гэты зварот. Подпіс паставіць можна ў сакратарыяце Прэзідыуму гарадзкога Савету.

С.С.

ГАРАДЗЕНСКІЯ ПАЛІТЫКІ ЗЬБЯРУЦЦА ЗА СВАІМ «КРУГЛЫМ СТАЛОМ»

Гэта адбудзецца сёньня, а 17-й гадзіне. Ініцыятарам сумеснай нарады партый і грамадзкіх арганізацый нашага гораду стала Аграрная партыя.

Першая арганізацыйная сустрэча прадстаўнікоў палітычных плыняў Горадні адбылася 9 верасьня. На ёй старшыня абласной філіі аграрнікаў, сябра Прэзідыуму Вярхоўнага Савету Мечыслаў Гіруць адзначыў, што трэба аб'яднаць намаганьні ўсяго грамадзтва дзеля вываду краіны з крызісу. Па ўсіх асноўных эканамічных паказьніках Беларусь займае апошняе месца сярод краін СНД. Спадар Гіруць прывёў такі прыклад катастрафічнасьці сітуацыі: зараз калгасы вымушаны браць крэдыты нават для выплаты падаткаў дзяржаве - такога не было за ўсю гісторыю сельскай гаспадаркі Савецкага Саюзу і Беларусі. На думку сябра Прэзідыуму Вярхоўнага Савету, выратаваць Беларусь могуць рашучыя зьмены ў эканамічнай палітыцы. Накшталт такіх, якія зрабіў Ленін у 1920 годзе, калі, адмовіўшыся ад ідэалагічных догмаў, увёў у Савецкай Расеі НЭП.

Д.К.

БСДГ ПАМІРАЦЬ НЯ ХОЧА

Да 1 кастрычніка павінна адбыцца перарэгістрацыя ўсіх сяброў Беларускай Сацыял-Дэмакратычнай Грамады, якія не пажадалі ўвайсьці ў склад Беларускай Сацыял-Дэмакратычнай Партыі. Пасьля гэтага Фракцыя па захаваньні Грамады плануе правесьці VI надзвычайны зьезд БСДГ, абраць новае кіраўніцтва партыі і пацьвердзіць для Міністэрства юстыцыі наяўнасьць ня менш як 500 сяброў партыі, якія застаюцца ў складзе БСДГ. Сябры Фракцыі распаўсюдзілі таксама зварот, у якім, у прыватнасьці, гаворыцца: «Мы ўпэўнены, што нашую трывогу за лёс Грамады падзяляюць многія прадстаўнікі беларускай грамадзкасьці. Зьнікненьне з палітычнай арэны нацыянальна арыентаванай, выступаючай за безумоўнае захаваньне беларускай дзяржаўнасьці партыі зьяўляецца недапушчальным». Зварот падпісалі такія вядомыя грамадзкія дзеячы, як Віталь Скалабан, Сяргей Законьнікаў, Уладзімір Конан, Уладзімір Кулажанка, Адам Мальдзіс, Алег Трусаў.

Віктар ЛЮДВІКОВІЧ.

А «ЗГОДА» НЕ ПРЫЙШЛА

5 верасьня ў Лідзе адбыўся ўстаноўчы сход мясцовай арганізацыі Беларускай Сацыял-Дэмакратычнай партыі «Народная грамада». Сход планаваўся як аб'яднаўчы для сяброў і Беларускай Сацыял-Дэмакратычнай Грамады, і Партыі народнай згоды, але лідзкія «згоднікі», вядомыя сваімі правертыкальнымі настроямі, на яго прыйсьці не адважыліся. На сходзе было 23 чалавекі. Утвораны дзьве суполкі і Лідзкая рэгіянальная арганізацыя БСДГ «Народная Грамада». Абрана кіраўніцтва. Старшынём лідзкай рэгіянальнай рады стаў Адам Сіняк, настаўнік гісторыі школы N 15.

Станіслаў СУДНІК.

РЭФЕРЭНДУМ: ШТО РАБІЦЬ

Іронія лёсу: рэферэндум, вышэйшы акт дэмакратыі, у нас - просты шлях да дыктатуры. Галоўнае зараз пытаньне: як дзейнічаць дэмакратычным арганізацыям? .

У дэмакратычнай прэсе ўжо зьявіліся публікацыі з прапановамі прызываць да яго байкоту: лішнія выдаткі, абвастрэньне сітуацыі і г.д. Але трэба глядзець праўдзе ў вочы: нават, калі ня толькі дэмакраты, а Вярхоўны Савет у поўным складзе ляжа на парозе, усё роўна рэферэндум адбудзецца. Дэмакратаў жа яшчэ і папракнуць: маўляў, на словах за народ, а спытаць яго волю не жадаеце. І гэтая дэмагогія, як тое часта бывае, знойдзе падтрымку ў простых людзей. Таму - ня варта лішні раз падстаўляцца, а лепей зараз жа рыхтавацца да агітацыі за наш варыянт адказаў. Гэты варыянт не павінен быць заблытаны, а таму я прапаную выбраць усе чатыры адказы - «супраць».

Не сакрэт, што самае галоўнае пытаньне - першае, аб новай Канстытуцыі. Мне незразумела, як можна галоўны дакумант краіны, над якім працавала столькі сьпецыялістаў працяглы час, які прымаўся паартыкульна, з спрачкамі ледзь не за кожную коску, адным махам зьмяніць на варыянт, невядома кім і ў які тэрмін распрацаваны, і ў які закладзены Бог ведае якія «міны». Я асабіста ўзяць на сябе такую адказнасьць не магу, таму адкажу толькі «супраць».

Наконт сьвятаў адказ таксама павінен быць адмоўны. Хіба ня факт, што Дэкларацыя аб незалежнасьці прынята менавіта 27 ліпеня, і хіба нехта забараняе сьвяткаваць Дзень вызваленьня 3 ліпеня?

Наконт зямлі. Вядома ж, я за продаж зямлі і за прыватную ўласнасьць на яе. Але як ставіцца пытаньне? «Свабодны продаж без усялякіх абмежаваньняў». Але ж гэтага ні ў якой краіне няма! Нейкія мінімальныя рамкі дзяржава павінна паставіць. Так што адмоўны адказ тут ніякага крыміналу не нясе.

І аб сьмяротным пакараньні. Асабіста я зноў жа за яго адмену і за ўвядзеньне пажыцьцёвага зьняволеньня. Але большасьць насельніцтва зараз - супраць адмены сьмяротнай кары, і гэты настрой за кароткі тэрмін ня зьменіцца.

Такім чынам, з тактычных меркаваньняў я б агітавала за ўсе адказы «супраць». Гэта скіруе ў патрэбны бок асноўную інэртную масу. Айчына ў небясьпецы - вось сёньняшні лозунг, і як бы нам не паўтарыць сітуацыю 1933 году ў Германіі. Трэба дзейнічаць. Ня ўдасца пераламаць грамадзкую думку - што ж, можа быць і так, але зрабіць усё, што толькі можна, каб не скаціцца ў дыктатуру - наш абавязак перад народам і ўласным сумленьнем.

Сьвятлана ВЕРАС,
сябра БНФ, г.Бабруйск.

КАЛІ ПАРАЗУМНЕЕМ?

Вельмі часта чую паведамленьні, што дзесяткі, сотні чалавек з афраазіяцкіх краін затрымваюцца беларускімі памежнікамі на заходняй мяжы. Вось і ўзьнікае пытаньне: дык што, мы, беларусы, мы, падаткаплацельнікі, абараняем не свае межы, а межы Польшчы ды Летувы? Дзе на сьвеце яшчэ такі цуд ёсьць? Больш таго, не пусьціў ты афраазіятаў далей на Захад, яны застаюцца ў нас, а гэта значыць, што мы павінны гэтых вандроўнікаў карміць, лячыць, даваць ім прытулак. І як вядома, гэта ня лепшыя людзі былі і ў сваіх краінах, калі яны бадзяюцца нелегальна па ўсім сьвеце. Ад гэтых людзей дабра чакаць нельга. Калі б, напрыклад, нашыя памежнікі затрымвалі чужаземцаў недзе перад Воршай, вядома не было б ніякіх пытаньняў, бо гэта натуральна. А тут пытаньні і яшчэ раз пытаньні. Кажуць, што ў нас такая дамова з Расеяй. А калі б напрыклад суседзі ды і больш далёкія людзі пратапталі сьцежку праз агарод, ды яшчэ паміж хатай і хлявом, дзе жыве Галіна Радзівонаўна Лукашэнка, ды яшчэ розны бруд па гэтай сьцежцы везьлі? Цікава, як адрэагаваў бы гаспадар? Але ж не, тут гаспадар паклапаціўся аб сваёй «сядзібе», высокім мурам абнёс, ахову паставіў. А вось цэлая краіна Беларусь для нашага «Бацькі» не больш як адстойнік для бруду. Вось і хочацца спытаць: хто ж намі кіруе? Чаму мы такія? Думаецца, што нават айчым больш дбаў бы аб дзецях чужых, чым такі «бацька» аб сваіх.

Пытаньне другое. Больш года таму ўсенароднаабраны прэзідэнт заклінаў беларусаў. Маўляў, заменім нашую нацыянальную многавекавую сьвятыню бел-чырвона-белы сьцяг, на сталінска-бээсэсэраўска-лукашэнкаўскі і жыцьцё беларусаў стане райскім. Даверлівы несьвядомы беларус дзеля «райскага» жыцьця прадаў славутую гісторыю сваіх прашчураў, здрадзіў самаму сьвятому - сваёй мове, сімволіцы і тым самым здрадзіў сваім будучым нашчадкам, увагнаў іх у галечу. Больш таго, кожны жыхар краіны яшчэ з уласнай кішэні выняў трыста далярaў сваіх кроўных на замену сімволікі, з надзеяй, што заўтра ня толькі кампенсуе свае страты, але жыць стане як пры камунізме. Аднак час ідзе, а прывід чырвона-зялёнага камунізму штосьці не дапамагае, нават глыбей у бездань пхае. Ай ды беларус, калі ж ты розуму набярэшся?

І вось зноў чуваць, грыміць дынамік дзень і ноч: наш «бацька» нейкі кангрэс зьбірае, манкуртаў заклікае, рэферэндум прызначае, ды зноў нейкую хлусьню вызнае, каб на гэты раз ужо з даверлівага беларуса апошнія нагавіцы зьняць і ў статак нудзістаў усіх беларусаў загнаць.

Мікола КАНАХОВІЧ,
г.Пружаны.

© PDF: Kamunikat.org 2013
© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2013

© PDF: Kamunikat.org 2013
© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2013

АБМЕН БЫКА НА ІНДЫКА

Пры ўсёй павазе да нашага гандлю, ягонае становішча каротка намаляваць можна менавіта так... Гэта з поўнай відавочнасьцю высьветлілася на нядаўняй прэс-канферэнцыі, якую наладзілі начальнік абласнога ўпраўленьня гандлю і грамадзкага харчаваньня Л.Раманін і старшыня аблспажыўсаюзу А.Гаўрылік.

САМАЕДЗТВА

Начальнікі парадаваліся, што ў апошнія месяцы ўзрос тавараабарот, асабліва ў Лідзе, Смаргоні, Слоніме, Гарадзенскім раёне. Але! Калі некалькі гадоў таму ў агульным тавараабароце харчовыя і прамысловыя тавары разьмяркоўваліся прыкладна аднолькава, то зараз прадукты займаюць 70 і больш працэнтаў сярод усіх пакупак. Гэта значыць, людзі праядаюць усе даходы, усе зьберажэньні. Самі сябе праядаем...

БУЛЬ-БУЛЬ

Вельмі занепакоены кіраўнікі гандлю тым, што з рук дзяржавы сплыла манаполія на гарэлку. Нават прыклад прывялі: у царскай Расеі была «манаполька» і казна квітнела. Толькі пры гэтым забыліся сказаць, што пры цары-бацюшку вядро гарэлкі каштавала рубель з нечым (за адно гэта нельга прабачыць Ульянаву яго рэвалюцыю), і, маючы ў кішэні 15 капеек, здаровы мужык сьмела ішоў у карчму, дзе на гэтую суму набіраўся да парасячага піску! У нас жа, як паказвае горкі досьвед, манаполія наўпрост зьвязана з сталым ростам цэнаў. Вось і зараз абласное гандлёвае начальства ня стала аспрэчваць чуткі, што гарэлка ў хуткім часе падаражэе. Зьдзекуюцца з народу, як хочуць.

ХЛЕБ НАДЗЁННЫ

З гарэлкай шчыльна зьвязаны і хлеб, таму што абодва гэтыя прадукты вырабляюцца з адной сыравіны. Асабліва пільныя пакупнікі і ў Горадні, і ў іншых месцах, заўважылі: апошнім часам з хлебам узьнікла «напружэнка», таму што любімы народам прэзідэнт забараніў павышаць цэны на хлеб, але дазволіў узьнімаць цэны на муку! Што ў такім выпадку будуць рабіць пякарні? Правільна, спыняцца. Помніцца, з такой нагоды каралева Францыі Марыя Антуанэта сказала: «У бедных няма хлеба? Няхай ядуць пірагі!» Зрэшты, ёй за гэта адсяклі галаву.

НЕПАТАПЛЯЛЬНЫЯ

Тое, што сказаў А.Гаўрылік, варта адліць з бронзы: спажывецкая кааперацыя была пры цары, была пры бальшавіках, будзе і зараз, «и присно, и во веки веков»! Хаця Закона аб кааперацыі няма: той парламант не прыняў, і «гэты, вядома, ня прыме». Чаму, уласна, «вядома»?

У вобласьці налічваецца 400 тысяч удзельнікаў, але яны нічога з гэтага ня маюць. Абарот аблспажыўсаюзу з пачатку году і да сёньняшняга дня -86 мільярдаў рублёў, што вельмі мала. А.Гаўрылік патлумачыў становішча на пальцах. Вы заплацілі ў краме за хлеб 3 тысячы, потым прыйшлі праз 3 дні і атрымалі свой бохан. Жахліва? Спажыўкааперацыя жыве менавіта так. Але жыве!

ФЯДОТ, ДЫ НЯ ТОЙ

Калі хрыстапрадаўцы крычаць, што ў нас нічога няма, і таму трэба інтэгравацца, яны нахабна замоўчваюць дары лесу. А лесам пакрыта больш за траціну тэрыторыі Беларусі! Колькі там багацьця схавана, прычым узяць гэта багацьце наканавана менавіта Спажыўсаюзу, таму што ён як бы знаходзіцца бліжэй за ўсіх да дзярна і моху. Вось і бяруць. У гэтым годзе закупілі 150 тон грыбоў лісічак, хаця маглі б купіць у 10 разоў больш. Астатнія грыбочкі паехалі ў Летуву. На прэс-канферэнцыі адна патрыятычна скіраваная журналістка ўпарта дапытвалася: «Чаму мы не маглі б узяць гэтыя грыбочкі самі?» На што А.Гаўрылік адказаў папулярна: «Таму што ў літоўцаў ёсьць жывыя даляры, а ў нас нават «зайцоў» няма». «Але чаму?» - не супакойвалася каляжанка. Аўтар гэтых радкоў не сьцярпеў і падаў рэпліку з месца: «Таму што ў літоўцаў іншы прэзідэнт». На такое хамства арганізатары прэс-канферэнцыі не адрэагавалі, таму што гэта праўда.

АБ'ЕКТ АСАБЛІВАЙ ВАЖНАСЬЦІ

Ці можна пабудаваць рынкавы сацыялізм у асобна ўзятай Беларусі? Не. А на асобна ўзятай вуліцы? Можна, калі гэта вуліца Паліграфістаў у Горадні. Дарэчы, для многіх будзе цікава даведацца, што аблспажыўсаюз з гэтай вуліцы мае 60 мільёнаў рублёў штомесяц! А на рамонт рынку толькі ў гэтым годзе выдаткавана 1,8 мільярда... Каб ачысьціць вуліцу, рыхтуюцца зноў задзейнічаць ніжнюю пляцоўку, здаецца гады тры таму там гандлявалі, і ўсё роўна ўсе не зьмяшчаліся. Гандаль ішоў і на могілках, і на чыгуначным насыпе. Напэўна прыдзецца зьнесьці друкарню, усё роўна яна толькі і ведае, што «Правый берег» не друкаваць. А чыгунку – пусьціць праз «Азот».

Ня сьмейцеся, калі ўціскаць правы гандляроў на рынку - гэта будзе адзіным фактарам, здольным ініцыяваць у Горадні масавыя выступленьні працоўнага люду, чаго так ня хоча прэзідэнт. Рэферэндум сьцерпім, але рынак нікому не аддамо!

Алесь НАРБУТ.

ДАЛЯР НЕ ПАДМАНЕШ

Даляр пачынае паводзіць сябе непрадказальна. Яшчэ ў панядзелак, 9 верасьня, курс яго продажу ў канторах быў роўным 17 800 рублёў, а ў аўторак ён падскочыў да 18 300 рублёў. Назіраецца масавае закрыцьцё дэпазітных рублёвых укладаў у банках Горадні.

С.С.

ПІЦЕ Ў ЗАПАС

Толькі такую параду можна даць аматарам сьпіртнога, бо, як толькі беларускія сьпіртзаводы прыступяць да вырабу сьпірту з зерня новага ўраджаю, кошт адной бутэлькі гарэлкі сяґне да 35-45 тысяч рублёў.

КАМЕРСАНТЫ Ў ЦАНЕ

Пасаду кіраўніка народнага прадпрыемства «Тэмп» г.Ліды на конкурснай аснове заняў былы прадпрымальнік Валеры Фарцоўскі. Калектыў, разгледзеўшы два бізнэс-планы, аддаў перавагу менавіта яму.

ХТО ЯШЧЭ НЕ ДАПАМАГАЎ БЕЛАРУСІ?

Днямі ў Дзятлава наведаліся актывісты скаўцкага руху з Люксембурга. Яны даставілі гуманітарную дапамогу больш як на два мільярды беларускіх рублёў. Лекі будуць разьмеркаваны паміж Дзятлаўскім тэрытарыяльна-медыцынскім аб'яднаньнем, санаторыем «Радон» і медустановамі Нясьвіжа. У складзе дэлегацыі некалькі лекараў. Яны сфармуюць заказ на наступны раз. Госьці з Люксембурга, а іх 15 чалавек, прабудуць у Дзятлаве 2 тыдні. Яны жывуць у сем'ях дзятлаўчан. Шмат хто тут ужо ня першы раз і мае даўніх сяброў.

НЕБЯСЬПЕЧНЫЯ СЕМКІ

Вядомы анекдот Віктара Шалкевіча пра ўкраінскую дыверсію супраць Беларусі ў выглядзе мяшкоў з семкамі, якімі мы ўжо ўсю Беларусь заплявалі, здаецца пачулі ў Карэлічах. Райвыканкам вынес там сьпецыяльную пастанову, адпаведна якой гандляваць семкамі можна толькі на рынках Карэлічаў і Міра.

ДА МЯЖЫ НЕ ДАБРАЛІСЯ

Івейскія міліцыянты ў чарговы раз праявілі павышаную пільнасьць. Яны затрымалі рэйсавы аўтобус «Мінск-Гродна». І не дарэмна. У аўтобусе аказаліся 52 асобы з Шры-Ланкі, Індыі і Пакістана, якія без усялякіх дакумантаў, харчу і грошай прабіраліся праз Расею і Беларусь у Прыбалтыку, а далей - на Захад. Найбольш незайздроснае становішча ў кіроўца аўтобуса, дарэчы, менчука.

НЯ СЬПЯЦЬ І Ў ТРАКЕЛЯХ

Тут затрыманы літоўскі аўтобус з 57 афраазіятамі. Справа накіраваная ў Смаргонскі памежны атрад.

Яраслаў ГРЫНЬКЕВІЧ.

МІЛІЦЭЙСКІ ПАСТАРУНАК - У КОЖНУЮ ВЁСКУ

Палова насельніцтва Гарадзенскай вобласьці на сёньняшні дзень ахоплена сеткаю дзейных пастарункаў міліцыі. У Горадні створана 11 пастарункаў, у Лідзе - 5, а ўсяго па вобласьці іх 30. На будучыню плануецца стварыць пастарункі ў мястэчках, такіх як Любча, Поразава, Рось. Штат супрацоўнікаў у іх будзе ад пяці і болей чалавек. Гэта дазволіць арганізаваць кругласутачнае нясеньне службы. Аднак брак грошай не дазваляе пакуль што цалкам разгарнуць сетку пастарункаў па ўсёй вобласьці.

С.С.

ПАЧЭСНАЯ ГРАМАТА - ГРОЗНАЯ ЗБРОЯ Ў БАРАЦЬБЕ З МАФІЯЙ

Гарадзенскі гарадзкі Савет дэпутатаў і гарадзкі выканаўчы камітэт 7 лютага прынялі рашэньне N 78 «Аб мерах па актывізацыі работы з насельніцтвам на месцы жыхарства, па паляпшэньні правапарадку і ўтрыманьні жыльлёвага фонду». Высокія інстанцыі засьведчылі складанасьць крымінагеннай абстаноўкі і працяг росту злачыннасьці. Павялічваюцца крадзяжы і рабункі, вулічная злачыннасьць, злачыннасьць непаўналетніх, п'янства і сямейна-бытавыя правапарушэньні.

Якія ж меры гарадзенскае начальства бачыць у якасьці эфектыўнага сродку барацьбы з злачыннасьцю? Сьцеражыся, мафія! Улады аднаўляюць «Палажэньне аб сходах па месцы жыхарства, грамадзкіх сельскіх, вулічных, квартальных і дамовых камітэтах у Беларускай ССР» ад 9 красавіка ажно 1981 году! Згодна з ім, сябры камітэту будуць весьці работу па выхаваньні грамадзян у духу камуністычнай маральнасьці і павагі да сацыялістычнага сужыцьця, сацыялістычнай уласнасьці. Вядома, што стаць «камітэтчыкам» можна не іначай, як з поклічу сэрца. Але і ім таксама хочацца есьці і часам піць. Таму ўлады «дзеля матэрыяльнага заахвочваньня» увялі плату «актывістам з ліку грамадзкасьці». Плаціць будуць па выніках кварталу і за год, а самым актыўным нават штомесячна. Адкуль грошы? З сродкаў, што выдзяляюцца на спартыўна-масавую работу.

Сьцеражыцеся, п'яніцы, лайдакі і сямейныя скандалісты! Бо з вамі будуць праводзіць работу «дамы ўзорнага ўтрыманьня і грамадзкага парадку». На падтрымку «узорным дамам» кінутыя міліцэйскія пастарункі. Колькасьць такіх дамоў лічыцца адным з паказьнікаў якасьці працы пастарункаў. Злачынцам раім абыходзіць «узорныя дамы» стараной. Даведацца пра іх проста: на будынку будзе вісець шыльда памерам 600 х 280 мм з надпісам чырвоным па белым.

Сцеражыцеся, прагульшчыкі! З вамі будзе разьбірацца «савет прафілактыкі» пад непасрэдным кіраўніцтвам «вертыкалі» і адміністрацыі прадпрыемства. Яны маюць права аб'яўляць папярэджаньні, хадайнічаць аб пазбаўленьні прэміі (насуперак, дарэчы, заканадаўству), накіраваньні ў ЛТП, пазбаўленьні бацькоўскіх правоў і нават аб высяленьні з кватэр. На прафсаюзы накладзены абавязак праводзіць «выхаваўча-прафілактычную работу сярод членаў працоўнага калектыву».

За посьпехі прадстаўнікі грамадзкасьці атрымаюць падзяку, альбо Ганаровую грамату з каштоўным падарункам.

На кіраўнікоў прадпрыемстваў накладзены абавязак тэрмінова даносіць у «вертыкаль» пра забастоўкі (галодных рабочых), галадоўкі (даведзеных да адчаю людзей).

Што тут скажаш? І сьмех, і грэх. Нядаўна ў старшыні гарсавету Ф.Гудзея, чый подпіс стаіць пад рашэньнем N 78, ледзь не з працоўнага месца скралі службовы аўтамабіль. Відаць, зламысьнік быў «ня ў курсе» аб «крутых» мерах прафілактыкі... А надоечы, літаральна пад нагамі на вуліцы, карэспандэнту «ПАГОНІ» папаўся ліст, накіраваны судом Ленінскага раёну ў адрас адміністрацыі МП «Сплаў» ад 20 жніўня г.г. У ім паведамляецца, што тынкоўнік «Сплаву» спадар С.І. пакараны за дробнае хуліганства («зьдзейсьніў скандал, на заўвагі не рэагаваў»). Можа суд хацеў, каб савет прафілактыкі «Сплаву» высяліў С.І. з кватэры? Ну, ня ведаю...

Пакуль «вертыкаль» размахвае чырвонымі сьцягамі, злачынцы могуць спаць спакойна.

Самсон САМАСУЙ.

ЛЕПЕЙ ПОЗНА, ЧЫМ НІКОЛІ

Доўга абяцанае адкрыцьцё першай у Беларусі польскай школы ў Горадні (мікрараён Дзевятоўка) да пачатку новага навучальнага году не адбылося. Набраныя ў гэтую школу вучні вучацца пакуль ў СШ N 22. Для заняткаў прызначана другая зьмена.

Школа пабудавана на грошы польскай дзяржавы. Польшча адзінай умовай паставіла забесьпячэньне абсталяваньнем класаў за кошт Беларусі.

Адкрыцьцё польскай школы плануецца на 21 верасьня. У гэты дзень чакаецца прыезд польскага і беларускага прэм'ер-міністраў.

С.С.

ПАЎМІЛЬЯРДА ЗА «СУСЛА»

Замежнае прадпрыемства «Экс-Імпэкс» увозіла ў Рэспубліку Беларусь вінаградны сідр. Паколькі сідр адносіцца да алкагольных вырабаў, то пры ўвозе і рэалізацыі сідра павінны выплочвацца мыт і акцыз. Каб не плаціць гэтыя падаткі, «Экс-Імпэкс» вырашыў аформіць сідр як сусла (неасьветлены прадукт браджэньня). Гэта дорага каштавала замежнаму прадпрыемству.

Падаткавая інсьпекцыя выкрыла запазычанасьць за 1995-1996 гады ў памеры 541 989 200 рублёў, а таксама наклала арышт на маёмасьць фірмы (аўтамабіль «Мэрсэдэс», абсталяваньне - усяго на 94 млн. 806 тысяч рублёў). Далей уключылася пракуратура, якая узбудзіла крымінальную справу.

Пакуль пракуратура вобласьці праводзіць папярэдняе рассьледаваньне, Гаспадарчы суд Гарадзенскай вобласьці задаволіў іск падаткавай інсьпекцыі і спагнаў з фірмы нядоімкі па падатках, зьвярнуўшы спагнаньне і на арыштаваную маёмасьць.

Кепска падманваць дзяржаву. Але дзяржава сваёй памылковай мытнай і акцызнай палітыкай сама штурхае людзей на махлярства. Мяркуйце самі.

У Францыі літр лепшага ў сьвеце маладога бургундзкага віна «бажале» каштуе каля $ 1. У нас - бутэлька балгарскага каля $ 5. Нядаўна прадстаўнік малдаўскага ўраду наракаў на тое, што мыты і акцызы перашкаджаюць экспарту віна на Беларусь.

Гэта пры тым, што вінаград у нас не расьце, а пладова-ягадныя віны ўласнай вытворчасьці ў народзе трапна завуцца «барматухай». Улады лічаць за лепшае, калі народ п'е «барматуху», але мясцовыя бровары плоцяць у казну падаткі.

Такім чынам, застаецца адно - пашкадаваць кіраўнікоў «Экс-Імпэкса» і саміх сябе. Бо ўрадавыя чыноўнікі, вядома, «барматуху» ня п'юць.

Сяргей САМАСЕЙ.

У ЗГОДЗЕ І КАХАНЬНІ

У невялічкай вёсачцы Восьнікі, што ў Скідальскім сельскім Савеце, жывуць адны пенсіянеры. Сярод іх і сям'я Рыгора Мікалаевіча і Валяньціны Сямёнаўны Бырдаў.

Сямейная пара Рыгора Мікалаевіча і Валяньціны Сямёнаўны (на здымку) вядомая ў акрузе сваім моцным шлюбам.

Яны ў згодзе і каханьні пражылі разам 64 гады. Ажаніліся ў 1932 годзе, калі Валяньціне было 17, а Рыгору 21 год. Цяпер жа ёй 81, а яму 85 гадоў. За гады сямейнага жыцьця нажылі чацьвёра дзяцей (два сыны і дзьве дачкі), чацьвёра ўнукаў і дзьве праўнучкі.

- У 1932 годзе, - успамінае Валяньціна Сямёнаўна, - пры чарговай сустрэчы Рыгор сказаў, што ад мяне не адступіць ні на крок, што я яму вельмі спадабалася. У сваю чаргу, спадабаўся мне і Рыгор, які быў вельмі дабрадушным хлопцам. Я дала згоду выйсьці за яго замуж. І не памылілася: усе гады сямейнага жыцьця мы разам дзялілі радасьці і гора. Але на нашу долю выпала больш гора, чым радасьці. Заўчасна ня стала дачкі Ліды, сына Валодзі, а затым і Колі. Але ж, даў Бог, гора неяк перажылі, дапамаглі яго пераадолець дачка Ніна, унукі і праўнукі.

Ільля БАРЫСАЎ.

РАСЕЙСКАЯ ДУЛЯ

Вось-вось расейскія войскі пакінуць лідзкі Паўночны гарадок і іх нерухомая маёмасьць пяройдзе да камунальнікаў горада. Адзін з ужо вызваленых будынкаў, былую казарму, было пастаноўлена аддаць пад школу N 2. Побач з казармай - спартыўная зала. Але, калі зайшла гаворка пра датэрміновую перадачу гэтай залы пад тую ж школу, камандаваньне расейскай часткі ўстала на дыбы: «Усё будзе перададзена разам і ў тэрмін».

Прайшоў які час, і ў гарвыканкаме прагучаў тэлефонны званок: «Забірайце залу». Што зьмянілася ў настроі расейскіх вайскоўцаў стала зразумела, калі прадстаўнікі гарвыканкаму зайшлі ў будынак: « з мясам» выдраны дзьверы і вокны, пазрываны ўсе батарэі, да апошняй дошкі абадраныя столь і падлога.

Вацлаў СЯРПІНСКІ.

© PDF: Kamunikat.org 2013
© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2013

© PDF: Kamunikat.org 2013
© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2013

16, ПАНЯДЗЕЛАК

Белорусское телевидение

15.00 Новости.
15.10 «Флиппер».
15.35 ТВ — школе.
16.00 Студия «Окно».
16.35 В плену времени.
17.05 На добрый лад.
17.20 «Крок».
17.50 Музыкальный антракт.
18.00 Финансовое время.
18.25 Экономикст.
18.35 MTV.
18.50 Новости.
19.00 Референдум: откровенный разговор.
19.50 Белорусский дом.
20.25 Актуальное интервью.
20.40 Колыбельная.
21.00 Панорама.
21.45 Спортивный телекурьер.
22.05 Фильмотека. «Девушка без адреса».
23.30 Футбол. Чемпионат Беларуси. «Локомотив-96» (Витебск) — МПКЦ (Мозырь). Т. 2.
0.20 Новости.

ГРОДНО:

18.00 Неделя.
18.30 Радар. Операция «Внимание, дети!»
18.45 «Кронан»

ОРТ

14.00 Новости.
14.20 «Город собак». Мультсериал.
14.45 Марафон-15.
15.00 Звездный час.
15.40 «Элен и ребята».
16.05 Джэм.
16.30 «Вокруг света».
17.00 Новости.
17.20 «Новая жертва».
18.10 Час пик.
18.35 «Угадай мелодию».
19.00 Пресс-клуб.
19.45 «Спокойной ночи, малыши!».
20.00 Время.
20.40 «Багз — электронные жучки». «Убийство на свадьбе».
21.45 «До и после...»
22.30 Кубок мира «Мастер-ралли-96».
22.45 Новости.
22.55 «Линия кино». «Скорбное бесчувствие».

Канал «Россия»

16.00, 19.00, 23.00 Вести.
16.20 Блок-нот.
16.35 «Челленджерс».
17.05 Зависит от тебя.
17.20 Тележурнал «О.Т».
17.30 L-клуб.
18.15 Момент истины.
19.30 «Санта-Барбара». Х/ф.
20.30 Дневник Кубка мира по хоккею.
21.00 Погода на завтра.
21.05 «На острие ножа». Х/ф.
22.00 Телескоп.
22.30 Прохладный мир.
23.20 Товары — почтой.
23.30 Музыка всех поколений.
23.40 «Не спи и смотри».

Санкт-Петербург

13.00 Срок ответа — сегодня.
13.30 Советы садоводам.
13.40, 20.35 Телеслужба безопасности.
13.55, 16.00, 18.55, 22.10, 23.05 Информ ТВ.
14.10 «Первая любовь».
14.55 «Жизнь Клима Самгина». С. 9.
16.10 Международное обозрение.
16.35 «Философия по Филу».
17.00 Стиль жизни.
17.05 «Солти».
17.35 Показывает ЛОТ.
18.40 Большой фестиваль.
19.15 Спорт.
19.20 «Первая любовь».
20.10 II Международный театральный фестиваль им. А.П.Чехова.
20.55 Спортивное обозрение.
21.05 «Жизнь Клима Самгина». С. 9.
22.20 «Исторические расследования».

IV канал, НТВ

6.00 Анонс недели.
6.10 Сериал для жаворонков. «Мафия-1».
6.50 Х/ф «Замкнутый круг»
8.25 «Человек в маске».
9.00, 13.00 Сегодня.
9.20 Д/ф «Вспомним те годы. 1971».
10.15 Лучшие цирки мира. «Металлический клоун».
11.15 Мир кино. Х/ф «Логово белого червя».
12.50 Русский альбом. Группа «Алиса».
* 3- альбо 4-пакаёвую кватэру.
Тэл. 5-69-71

МЯНЯЮ

* 5-пакаёвую кватэру на двух узроўнях на 3- і 2-пакаёвую, 4- і 1-пакаёвую. Прапанаваць варыянты.
Тэл. 2-86-45

* пакой у камунальнай кватэры г.Верхнядзьвінска (балкон, усе выгоды) на частку дома ў Віцебскай вобласьці ці кватэру без выгодаў.
Тэл. у Верхнядзьвінску 2-28-49

* 2-пакаёвую кватэру старой планіроўкі ў Слоніме + даплата на кватэру ў Горадні.
Тэл. 72-50-50, увечары

* 4-пакаёвую кв. н.пл. на 2- і 2-пакаёвую ці 3- і 1-пакаёвую. Прапаноўваць варыянты.
Тэл. 2-93-51

ПАСЛУГІ

* Навошта вам лішняя вага? Кожны лішні кілаграм - цаглінка, якая цісьне на сэрца, пазваночнік і сасуды, скарачае ваша жыцьцё.
Тэл. 44-92-06, Сьвятлана

* Англа-амерыканская мова.
Тэл. 44-86-00

* Абіўка дзьвярэй, урэзка замкоў.
Тэл. 72-56-32

* Кузаўныя работы, зварка, рыхтоўка, падрыхтоўка да пакраскі.
Тэл. 45-45-57 з 8.00 да 17.00, 31-92-91 пасьля 18.00

* Прафесійна-музычнае абслугоўваньне вясельляў.
Тэл. 72-24-66

* Нямецкая мова: кансультацыі, пераклады, дзелавая перапіска, рэпетытарства.
Тэл. 5-50-60

* Абліцоўка.
Тэл. 5-91-57

* Раблю хімічныя завіўкі.
Тэл. 5-63-52

* Дэвіз сёньня – прыгажосьць і здароўе. Натуральная касметыка, сродкі для пахудзеньня фірмы «Джэйсан».
Тэл. 5-50-60

* Рэпетырую біялогію.
Тэл. 44-96-69

* Прафесійны рамонт швейных машын і аверлокаў усіх відаў кваліфікаваным майстрам.
Тэл. 6-33-49

* Кантрольныя працы і рэпетытарства па хіміі. Самы нізкі ў Горадні кошт.
Тэл. 5-16-40 пасьля 18 гадзін

* Фотаздымка.
Тэл. 2-41-97

* Цагляная кладка.
Тэл. 6-33-49.

* Амерыканскія біяпрэпараты мужчынам для павышэньня палавой патэнцыі.
Тэл. 5-50-60

150-200 ТЫСЯЧ РУБЛЁЎ ЗА 2 ДНІ!

Запрашаем да супрацоўніцтва пенсіянераў, студэнтаў, беспрацоўных у якасьці грамадзкіх распаўсюднікаў «ПАГОНІ».

Аплата - 30% ад кошту рэалізаваных экзэмпляраў газеты.

Гэта азначае, што за пятніцу і суботу Вы зможаце зарабіць 150-200 тысяч рублёў.

Даведкі па тэлефонах: 72-29-96, 72-35-61.

ПАГОНЯ

РОЗНАЕ

* Што нельга купіць за грошы? Правільна! Сяброўства! Міжнародная мова эсперанта дапаможа знайсьці вам шмат новых і цікавых сяброў.
Тэл. 6-30-15

* Алесь Шустоўскі з Барысава, АДГУКНІСЯ! Горадня, зав.Даватара,8-А, кв.44, Ліза.

* Патрабуецца сямейны інтэрнат, прававновы. Горадня-25, галоўпаштамт, а/с 114.

* Мужчына 32 гадоў бяз шкодных звычак шукае працу, альбо падпрацоўку. Магу працаваць у студыі кабельнага тэлебачаньня.
Тэл. 72-65-54

* Арганізуецца сустрэча выпускнікоў Вілейскай школы-інтэрната, 8 кл. - 1970 г.в., 10 кл. - 1972 г.в.
Тэл. у Вілейцы 5-53-50, у Менску 37-35-01

* Экспрэс-тэсты для вылічэньня цяжарнасьці, вытворчасьць ЗША, дастаўка.
Тэл. 5-38-12

* Шукаю працу сакратара-рэферэнта, сакратара-машыністкі, гандляра ці дысьпетчара.
Тэл. 6-33-49

* Патрабуецца стаянка для аўтамабіля, прыватны сектар вул.Сухамбаева, Каліноўскага, Веры Харужай.
Тэл. 33-46-36

* Впервые в Гродно! Открыт бесплатный заочный курс по изучению Библии, пройдя который вы найдёте для себя ответы на вопросы: Скоро ли придёт Христос? Что нас ждёт после смерти? Что есть непростительный грех? Почему в мире столько страданий? На эти и на многие другие вопросы вы получите ответ написав по адресу: г.Гродно:, 230009, а/я 14 З.Б.К. Вскоре вы получите 1-й из 24-х уроков, а также в подарок Библейскую лит-ру.

ЗНАЁМСТВЫ

* Малады чалавек 30/165 пазнаёміцца са стройнай прывабнай забясьпечанай дзяўчынай да 30 гадоў бяз шкодных звычак, ня быўшай раней у шлюбе, з мэтай утварэньня сям'і. 230025, Горадня, галоўпаштамт, п/п IV-ДР N 706368, да запатрабаваньня.

* Мужчына 32/188/82, беларус, адукацыя вышэйшая, пазнаёміцца для сустрэч з прывабнай жанчынай ад 29 гадоў, ростам ад 170 см, якая мае для гэтага месца. У персьпектыве магчымы шлюб. Пісаць: 230009, Горадня-9, а/с 198.

* Жанчына 33 гадоў пазнаёміцца з сумленным мужчынам для сур'ёзных намераў. 231300, г.Ліда-6, п/п V-ДР N 659406

* Хлопец 20/178/70 чакае сэксуальнай прыгоды з дасьведчанай асобай. Разгледжу самыя неверагодныя прапановы. Мне надакучыла жыць адной вучобай. Захапленьні: спорт, палітыка. 220074, п/с 155.

ВІНШАВАНЬНІ

* Шаноўнага Аляксандра Богуша віншуюць з днём нараджэньня калегі па колішняй рабоце ў лідзкай газеце «Уперад» і верныя сябры з Лідзкага раёну. Добрага здароўя Вам, Аляксандр Уладзіміравіч, шчасьця ў жыцьці.

* Любую матулю і жонку Багатырэвіч Ядзьвігу Іосіфаўну віншуем з 50-годдзем. Жадаем здароўя, шчасьця, усяго найлепшага.

Муж і дзеці.



КУПОН - ПРЫВАТНАЯ АБ'ЯВА

23 Імя і прозьвішча .....

Адрас (тэлефон) .....

Рубрыка .....

Тэкст .....

БЯСПЛАТНА

Выразаны купон з тэкстам аб'явы адпраўце поштай, альбо прынясіце ў рэдакцыю самі.

ПАГОНЯ
230023, Горадня, вул. Дамініканская,1

☎ 72 - 29 - 96

Прыватныя бясплатныя аб'явы прымаюцца ў нас і па тэлефоне кожны дзень, акрамя суботы і нядзелі.

ПУБЛІКАЦЫЯ – У ПЯТНІЦУ.

АЎТАМАБІЛЬНЫ РЫНАК



КОШТЫ НА АЎТАМАБІЛІ НА БЕЛАСТОЦКАЙ БІРЖЫ НА МІНУЛЫМ ТЫДНІ. ЦЭНЫ ПАДАДЗЕНЫ Ў ТЫСЯЧАХ НОВЫХ ЗЛОТЫХ

Курс злотага да долара складае $ 1 = zl. 2,75

Лада, 1992 г.в., zl. 12,8
Лада, 1991 г.в., zl. 10,4-11,2
Лада, 1990 г.в., zl. 9,2-9,6
Лада, 1989 г.в., zl. 8,4-8,7
Лада, 1988 г.в., zl. 7,2-8,1
Лада, 1987 г.в., zl. 6,8-7,0
Лада, 1986 г.в., zl. 5,8-6,6
Лада-Самара, 1991 г.в., zl. 11,0-12,8
Лада-Самара, 1990 г.в., zl. 9,5-10,2
Лада-Самара, 1989 г.в., zl. 8,4-9,7
Лада-Самара, 1987 г.в., zl. 7,5
Лада-Самара, 1986 г.в., zl. 6,5-6,8
Масквіч, 1991 г.в., zl. 6,9
Масквіч, 1990 г.в., zl. 5,3
Таўрыя, 1994 г.в., zl. 11,0
Таўрыя, 1992 г.в., zl. 7,0-7,2
Таўрыя, 1991 г.в., zl. 5,7-7,0
Таўрыя, 1990 г.в., zl. 5,8-6,6
Таўрыя, 1989 г.в., zl. 5,3-6,1
Таўрыя, 1988 г.в., zl. 5,1
Шкода-Фаварыт, 1992 г.в., zl. 14,0-14,5
Шкода-Фаварыт, 1991 г.в., zl. 12,5-13,0
Шкода-Фаварыт, 1989 г.в., zl. 7,5
Шкода-Фаварыт, 1988 г.в., zl. 5,0
Паланэз, 1995 г.в., zl. 17,8 -19,0
Паланэз, 1994 г.в., zl. 15,2-16,0
Паланэз, 1993 г.в., zl. 11,8-13,4
Паланэз, 1992 г.в., zl. 10,5-12,6
Паланэз, 1991 г.в., zl. 10,5-11,0
Паланэз, 1990 г.в., zl. 8,2-9,0
Паланэз, 1989 г.в., zl. 6,5-7,5
Паланэз, 1988 г.в., zl. 5.7-6,5
Паланэз, 1987 г.в., zl. 4,9-5,5
Паланэз, 1986 г.в., zl. 3,7-4,6
Фіат-Пунта, 1995 г.в., zl. 28,0
Фіат-Уна, 1995 г.в., zl. 22,2
Фіат-Уна, 1993 г.в., zl. 16,0
Фіат-Уна, 1990 г.в., zl. 15,8
Фіат-Уна, 1987 г.в., zl. 10,5
Фіат-Тыпо, 1990 г.в., zl. 16,8-17,0
Фіат-Тыпо, 1989 г.в., zl. 16,5
Фіат-Тэмпра, 1995 г.в., zl. 27,5-28,0
Фіат-Тэмпра, 1992 г.в., zl. 21,5-23,0
Альфа-Рамэа, 1988 г.в., zl. 18,2
Сеат-Ібіца, 1987 г.в., zl. 8,5
Вольва 440, 1990 г.в., zl. 22,5
Вольва 440, 1989 г.в., zl. 18,2
Вольва 460, 1991 г.в., zl. 21,0
Фальксваген-Гольф, 1994 г.в., zl. 36,0
Фальксваген-Гольф, 1993 г.в., zl. 29,5
Фальксваген-Гольф, 1992 г.в., zl. 30,0
Фальксваген-Гольф, 1988 г.в., zl. 16,5
Фальксваген-Гольф, 1987 г.в., zl. 14,3
Фальксваген-Гольф, 1986 г.в., zl. 12,7
Фальксваген-Джэта, 1990 г.в., zl. 20,0
Фальксваген-Джэта, 1987 г.в., zl. 15,5
Фальксваген-Пасат, 1992 г.в., zl. 33,0
Фальксваген-Пасат, 1991 г.в., zl. 27,0
Фальксваген-Пасат, 1990 г.в., zl. 27,0
Фальксваген-Пасат, 1989 г.в., zl. 22,5
Фальксваген-Пасат, 1988 г.в., zl. 19,3
Фальксваген-Пола, 1989 г.в., zl. 14,1
Аўдзі 80, 1993 г.в., zl. 39,0
Аўдзі 80, 1991 г.в., zl. 24,7
Аўдзі 80, 1990 г.в., zl. 25,0
Аўдзі 80, 1989 г.в., zl. 23,0
Аўдзі 80, 1988 г.в., zl. 18,5
Аўдзі 80, 1986 г.в., zl. 11,1
Аўдзі 100, 1992 г.в., zl. 35,0
Аўдзі 100, 1991 г.в., zl. 34,9
Аўдзі 100, 1990 г.в., zl. 30,0
Аўдзі 100, 1987 г.в., zl. 15,6
Аўдзі 100, 1986 г.в., zl. 15,8
БМВ 316, 1989 г.в., zl. 20,0
БМВ 318, 1991 г.в., zl. 35,0
БМВ 520, 1988 г.в., zl. 34,1
БМВ 525, 1991 г.в., zl. 41,5
Мэрсэдэс 190, 1986 г.в., zl. 21,5
Мэрсэдэс 200, 1987 г.в., zl. 28,5
Мэрсэдэс 230, 1989 г.в., zl. 33,3
Мэрсэдэс 300, 1987 г.в., zl. 33,0
Мэрсэдэс 300, 1986 г.в., zl. 26,5
Таёта-Кампры, 1994 г.в., zl. 67,0
Таёта-Кампры, 1992 г.в., zl. 48,5
Мазда 323, 1994 г.в., zl. 37,2
Мазда 323, 1991 г.в., zl. 21,0
Мазда 323, 1990 г.в., zl. 19,5

КІНААФІША ГОРАДНІ

«КАСТРЫЧНІК»: 14,15,16 верасьня - «Зачараваная служанка» - 10.00 (ільготны) - 11.40, 13.20, 15.10. «Гульні патрыётаў» - 15.00, 16.50, 18.40, 20.30. «Калі гэта каханьне» - 15.30, 17.20. «Пад зорным знакам сэксу» - 19.10, 21.00. ВІДЭА: «Раптоўная сьмерць» - 15.00. «Варожыя намеры» - 16.50. «Невынішчальны шпіён» - 18.40, 20.30. КІНО -ДЗЕЦЯМ: Ералаш (32-62) - 12.00. «Усе сабакі пападаюць у рай» (ф.2) -13.30. Кожную сераду і нядзелю - Школьная дыскатэка - 18.30. НАЧНЫ КЛУБ: штодзённа музычна-забаўляльная праграма - 22.00 (панядзелак і аўторак - выходныя).

«ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА»: 13 верасьня - «Прыбыцьцё» (фант.баявік) - 12.10, 16.50. «Джэймс і гіганцкі персік» (дзецкі) - 16.30. «Ланцуг» (супербаявік) - 14.20, 18.40.

«ГРОДНА»: 13-17 верасьня - «Адкрыты агонь» (баявік) - 9.50, 11.40, 13.30, 15.20, 19.10, 21.00. ВІДЭА: 13 і 14 верасьня - «Паўстаўшыя з пекла-4» (жахі), 15,16 верасьня - «Мафіі насуперак» (баявік), 17,18 верасьня - «Мацнейшы ўдар-2» (баявік), 19,20 верасьня - «Страшны суд» (баявік). Сеансы: 10.00, 12.00, 14.00, 16.00, 18.00, 20.00.

імя ПУШКІНА: 13 верасьня - «Касьмічныя пехацінцы» (фант.баявік) -10.00, 15.30. «Падземны вецер» (фант.баявік) - 16.50, 19.10. «Мечаны» (баявік) - 13.40, 17.20. Дыскатэка - 20.30. «Вяртаньне вулічнага байца» - 11.20.

«КОСМАС»: аўтаадказчык - 44-01-81.

«УСХОД»: аўтаадказчык - 47-81-29.

ПРАЦОЎНЫЯ ВАКАНСІІ

Усе зьвесткі дадзены па стану на 10 верасьня.

МП «Аўташкола», т.72-30-27, **муляр-тынкоўшчык**

Фірма «Будоўля», т.72-38-11, **сьлесар-электрык** (5 разрад), з-та 800 тыс.руб.

ДАП 1, т.5-24-13, 2-53-40, **сьлесар па рамонту аўтамабіляў**

Гімназія, т.6-16-45, **сьлесар-сантэхнік**

Прадпрыемства па забесьпячэньні нафтапрадуктамі, т.31-22-43, **бетоншчык-сьлесар па рамонту будынкаў, муляр** (5 разрад), **маляр** (5 разрад), **майстар будаўнічых работ, цясьляр** (5-6 разрад), **электрагазазваршчык** (6 разрад). З-та 2 млн. рублёў.

Гархарчгандаль, т.72-01-90, **бляхар** (5-6 разрад)

Гроднаінтэртранс, т.2-14-43, **тынкоўшчык**

Гроднамэбля, т.47-82-37, **станочнік дрэваапрацоўчых станкоў**, з-та 600 тыс.руб.

МП «ДВС», т.33-44-07, **начальнік трыкатажнай вытворчасьці**, з веданьнем вязальнай вытворчасьці

Дырэкцыя па рэстаўрацыі, т. 44-50-98, **сталяр** (вокны, дзьверы, 4-5 разрад)

Кааператыў «Давер», т. 2-92-88, **сьлесар па рамонту аўтамабіляў**

ДБУ-18, т.99-11-02, 6-80-44, **машыніст аўтакрана** МАЗ-500, **электрагазазваршчык** з вадзіцельскім пасьведчаньнем (В, С, Е). 3-та 1 млн.руб.

Прадпрыемства «Нёман» (ад Рамбуда), т. 33-66-30, **бетоншчык-цясьляр, намесьнік дырэктара** (з веданьнем польскай мовы), **муляр, цясьляр-сталяр, прараб, сьлесар-сантэхнік, электрагазазваршчык**

Інтэрнат УУС, т.47-73-40, **сьлесар-электрык** (сілавы допуск), з-та 308 тыс.руб.

Гароднінная фабрыка, т. 6-06-93, 6-62-64, **рамшчык** (5-6 разрад), на піларараму, з-та 1 млн.400 тыс.руб.

Фірма «Орбікс», т. 33-15-74, **тынкоўшчык** (4-5 разрад)

ПМК-71, т. 47-03-76, 47-02-48, **машыніст аўтакрана** (да 10 тон), з-та 1 млн.руб.

Будбытрамонт, т. 31-38-87, **бетоншчык, начальнік участка** (з вопытам, каналізацыя-вадаправод)

Фірма «Садко», т.2-43-23, **плітачнік**, (4 разрад), **электрагазазваршчык**

Будаўніча-мантажны цягнік 294, т. 47-58-96, **цясьляр** (4 разрад), з-та 1 млн.500 тыс.руб.

СШ 1, т. 45-37-73, 45-32-80, **сталяр**, з-та 400 тыс.руб.

Трэст Белспецмантаж, т.33-16-01, 33-02-74, **электрагазазваршчык** (4-6 разрад), з-та 1,5 млн.руб.

Універсітэт, Ажэшка,22, **бібліятэкар** (да 35 гадоў)

Фірма «Фадэн», т.72-21-54, **гал.бухгалтар** (30-35 год, вопыт у вытворчасьці), з-та 2 млн.руб.

ФАК «Юбілейны», т.33-63-35, 33-02-75, **электрагазазваршчык** (4-5 разрад), 1 млн.200 тыс.руб.

ПМК Гроднааблагрпрамбуд, т. 2-35-71, **муляры, тынкоўшчыкі.**

© PDF: Kamunikat.org 2013

© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2013

ДАТЧАНЕ АДКРЫЛІ ДЛЯ СЯБЕ БЕЛАРУСЬ

дзякуючы візіту ў Данію Гарадзенскага хору «Бацькаўшчына».

Наш карэспандэнт сустрэўся з кіраўніком гэтага калектыву спадарыняй Верай Кунцэвіч.

- Спадарыня Вера, як хор патрапіў у Данію?

- У Горадню прыязджаў пастар Эрык Ланкер. Ён прывозіў гуманітарную дапамогу для прыходу Каложскай

Бацькаўшчына" на палубе ветразьніка

царквы. Пазнаёміўшыся з хорам, спадар Лангер запрасіў нас да сябе ў горад Колдзінг. Дзякуючы пастару Эрыку і гарадзкім уладам Колдзінга, напрыканцы жніўня мы і наведалі Данію.

- Дзе праходзілі вашы канцэрты?

У асноўным - у Колдзінгу і яго акрузе. Таксама нам арганізавалі некалькі канцэртаў на ўзьбярэжжы Паўночнага мора. Выступалі мы ў розных месцах: у мэрыі Колдзінга, у навучальных установах, перад колдзінгскімі пажарнымі, нават на караблях. Але галоўныя канцэрты былі ў цэрквах.

Трэба адзначыць, што царква ў Даніі, гэта месца, дзе людзі ня толькі моляцца. Датчане прыходзяць у храм, каб сустрэцца з знаёмымі, абмеркаваць свае справы, паслухаць добрую музыку. Таму нашы канцэрты складаліся з дзьвюх частак - духоўныя сьпевы і народная музыка.

- Як датчане ўспрынялі беларускія песьні?

- Цудоўна! Мы нават не чакалі, што будзе такі посьпех. Паслухаць хор прыходзіла шмат людзей. Дацкія газеты надрукавалі вельмі прыхільныя артыкулы пра нашыя выступы.

У Даніі наогул дрэнна ведаюць усходнеэўрапейскую культуру, а беларускую - тым больш. Наколькі мне вядома, да «Бацькаўшчыны» там быў толькі адзін беларускі калектыў з Менску. Спачатку нас успрымалі, як расейцаў. Але сваімі сьпевамі мы даказалі, што беларусы зусім іншы народ. Датчане нам так і казалі, што мы адкрылі для іх Беларусь. Прыходзілася шмат расказваць пра нашу краіну. Многія пажадалі да нас прыехаць. Мы з задавальненьнем запрасілі іх у госьці.

- Якія падзеі пад час побыту ў Даніі вам больш запомніліся?

- Вельмі цяжка адказаць. Усё было цудоўна. Хіба што можна выдзяліць выступ на ветразевым караблі. На ім юнакі і дзяўчаты праходзяць марскую адукацыю. Мы сьпявалі на палубе. Гэта было вельмі незвычайна. І апошні наш канцэрт, які супаў з закрыцьцём сезону культуры Колдзінга. Па ўсім горадзе выступалі рок-гурты, народныя калектывы. Наш выступ у саборы Колдзінга скончыўся апоўначы. Потым пачаўся агульнагарадзкі карнавал. «Бацькаўшчыну» запрасілі да сябе ў намёт скаўты. Яны папрасілі засьпяваць наш галоўны твор. Мы выканалі «Магутны Божа». Юнакі адчулі, што гэта беларускі духоўны гімн і слухалі стоячы.

- Якое ўяўленьне склалася ў вас пра датчанаў?

- Нягледзячы на тое, што нашыя краіны вельмі розныя, датчане падобныя на беларусаў. Адчувалася людзкая цеплыня, добразычлівасьць. Культурны, прыгожы народ.

МАСТАЦКІ ТЭЛЕГРАФ

6-11 верасьня на Гарадзеншчыне і Віленшчыне прайшлі дні знакамітага польскага пісьменьніка Генрыка Сянкевіча, прымеркаваныя да 150-годдзя гэтага лаўрэата Нобелеўскай прэміі і майстра сусьветнай літаратуры. З гэтай нагоды ў Гарадзенскім дзяржуніверсітэце імя Я.Купалы сабраліся навукоўцы з Горадні, Кракава і Любліна каб абмеркаваць праблемы, якія тычацца творчасьці і грамадзянскай пазіцыі Генрыка Сянкевіча, і значэньне ягонага пісьменьніцтва для сусьветнай літаратуры. Навукоўцы і прыхільнікі прыгожага пісьменства прайшлі шлях па гістарычных мясьцінах: Горадня - Наваградак - Вільня - Мейшагола - Баранавічы. Вучні з польскага мястэчка Воля Закшэйска (радзіма Г.Сянкевіча) прапанавалі гледачам фрагмент сьпектакля «Янка-музыка» паводле аднайменнага твору пісьменьніка.

* * *

11 верасьня ў Горадні адбылася прэзентацыя новай праграмы гарадзенскага рок-гурта «Уяўныя людзі». Цікава тое, што сьвята адбылося на цеплаходзе і на ўзьбярэжжы Нёмана ля Старога замку. Відаць, нездарма новая праграма «Уяўных людзей» называлася «Вучыцеся плаваць».

* * *

14 верасьня ў Горадні ля Доміка рамёстваў па вул.Ажэшкі адбудзецца традыцыйны «Кірмаш рамёстваў на Гарадніцы». У праграме сьвята выстава-продаж мастацкіх вырабаў, знаёмленьне з народнымі майстрамі і выступленьне мясцовых музычных калектываў.

* * *

16 верасьня ў менскім Палацы мастацтваў адкрыецца выстава твораў сяброў Гарадзенскага аддзяленьня Саюзу мастакоў Беларусі. Свае творы ў сталіцы запрэзентуюць Сяргей Грыневіч, Вікторыя Загнетава, Мікалай Бандарчук, Антон Ляшчынскі, Сяргей Асапрылка, Юры Якавенка, Аляксандр Сільвановіч ды інш.

Ігар ГАНДЛЕЎСКІ.

НОВЫ ПОСЬПЕХ ДЗІНАРЫ МАЗІТАВАЙ

Самая юная ўдзельніца Міжнароднага музычнага фестывалю «Гімн вялікаму гораду» у Санкт-Пецярбурзе, вучаніца 6 класа школы N 17 г.Ліды, атрымала званьне лаўрэата конкурсу і ўзяла трэцюю прэмію.

Нялёгка было вызначыцца Дзінары сярод больш чым 400 удзельнікаў амаль з усіх краін СНД. Лідзянка пакарыла журы сьпецыяльна напісаным гімнам «Пятра тварэньне» і ўрыўкам з свайго балету «Дзюймовачка».

Дзінара запісала свае творы для праграмы «Заечы востраў» радыё Расеі, асобную праграму для «5 канала» і для праграмы «Раз талент, два талент».

«РАЗГОВОР»

Пад такой назвай выйшаў у Лідзе зборнік вершаў вядомага лідзкага паэта Віктара Бачарова. Віктар Бачароў працуе дырэктарам 13-й школы, дэпутат Лідзкага гарсавету, піша па-расейску.

Станіслаў СУДНІК.

КРЫЖАВАНКА

Склаў Сяргей ГРЫНЬ.



Па гарызанталі: 5.Аб'ява ў тэатры, кіно аб тым, што ўсе білеты прададзены. 6.Стан смутку з прычыны чыёй-колечы сьмерці, народнага гора, бедзтва. 9.Сьпецыяліст па канструяваньні новых відаў адзеньня, абутку. 10.Масавае народнае гуляньне з вулічнымі шэсьцямі. 14.Чалавек, які адмаўляецца ад жыцьцёвых задавальненьняў. 15. Невялікая малпа, якая вядзецца ў Азіі і Афрыцы. 17.Марка амерыканскага аўтамабіля. 18.Спосаб стварэньня малюнка, мастацкага ўзору шляхам наклейваньня або прышываньня кавалачкаў рознакаляровай матэрыі, паперы. 23.Адзін з персанажаў раману М.Булгакава «Мастер и Маргарита». 15.Шлях руху нябеснага цела. 17.Маленькае паразітычнае бяскрылае насякомае. 19.Посьпех у змаганьні. 20.Прылада для рэзаньня гародніны на невялікія кавалкі. 31.Тканіна, пакрытая ці прамочаная непрамакальным складам. 32.Мастацкі стыль у эўрапейскай культуры XVII-XVIII стст.

Па вертыкалі: 1.Прамежак, перапынак, адлегласьць паміж зьявамі ў часе або паміж пэўнымі пунктамі ў прасторы. 2.Славуты дзеяч ВКЛ. 3.Сьпецыяльны груз для забесьпячэньня правільнай асадкі і ўстойлівасьці судна. 4.Буйны ўладальнік зямлі, абшарнік. 7.Форма ветлівага звароту да мужчын у шляхецкім асяроддзі. 8.Мужчынская шапка з аколышкам і казырком. 12.Цялеснае пакараньне. 16.Від ядавітай трапічнай зьмяі. 17.Першая ступень гамы, а таксама галоўны тон трохгучча. 19.Вывучэньне зьяў аб'ектыўнага сьвету ва ўмовах, набліжаных да натуральных. 20.Фінансавы дакумант для вывучэньня і планаваньня выдаткаў і прыбыткаў. 21. Покрыва ў выглядзе шкарлупіны, тканіны або проста верхні слой чаго-колечы. 22.Частка нагі ўніз ад шчыкалаткі. 27.Сталіца дзяржавы Паўднёвай Амерыкі. 28.Выбуховае рэчыва, якое выкарыстоўваецца ў вайсковай і горнай справе.

АДКАЗЫ НА КРЫЖАВАНКУ, ЗЬМЕШЧАНУЮ Ў МІНУЛЫМ НУМАРЫ

Па гарызанталі: 5.Мытнік. 6.Навала. 9.Казка. 11.Аркуш. 12.Драпежнік. 15.Батура. 18.Індыкт. 19.Спартак. 20.Фізіка. 21.Гогаль. 23.Атланта. 26.Півоня. 27.Мікрон. 31.Партсігар. 33.Стоік. 34.Крэда. 35.Жаўнер. 36.Чэрава.

Па вертыкалі: 1.Нырка. 2.Бістро. 3.Маркіз. 4.Флірт. 7.Мастак. 8.Хустка. 10.Венгры. 13.Прэзідэнт. 14.Анталогія. 16.Спякота. 17.Кароста. 22.Карась. 23.Піраты. 25.Сольда. 28.Каўнер. 29.Партэр. 30.Ліван. 32.Крэва.

КАЛІ ГЭТА РАЎНАПРАЎЕ – ШТО ТАДЫ ДЫСКРЫМІНАЦЫЯ?

Аляксандр Лукашэнка мае ўсе шанцы пакінуць сьлед у гісторыі ня толькі як пераможца беларускай эканомікі і дэмакратыі. За час яго кіраваньня на Беларусі можа быць зьнішчана і нацыянальная адукацыя.

Такую сумную выснову можна зрабіць, пазнаёміўшыся з становішчам у гарадзенскім школьніцтве.

У 1994-95 навучальным годзе з 35 гарадзенскіх школ 27 былі беларускімі. Пасьля мінулагодняга рэферэндуму, у верасьні 1995 году толькі ў чатырох школах горада адукацыя маленькіх беларусаў пачалася на роднай мове. Па зьвестках Гарадзенскага Таварыства Беларускай Школы сёлета засталася адна беларуская школа, у некаторых захаваліся беларускія класы. Наогул у Горадні дзяржаўная мова зьяўляецца мовай выкладаньня толькі ў 22 першых класах.

Улады тлумачаць выцісканьне з школ беларускай мовы волевыяўленьнем бацькоў. Маўляў - права выбару мовы навучаньня дзяцей маюць выключна таты і мамы.

Няхай Бог і ўласныя дзеці будуць суддзямі тым выхадцам з беларускай вёскі, якія адмовілі сваім нашчадкам у адукацыі на роднай мове. За часы савецкай улады ў такіх людзей выпрацаваўся комплекс непаўнавартасьці, і зараз яны «цярпець ня могуць дзераўенскі язык». Але чаму парушаюцца правы бацькоў, якія ня страцілі чалавечую годнасьць?

Прыкладам такіх парушэньняў можа быць «выбар» мовы навучаньня ў СШ N 18 Горадні. На пачатак навучальнага году ў школе было 54 заявы ад бацькоў, якія пажадалі, каб іх дзеці вучыліся на беларускай мове. Але ніводнага беларускага класу адкрыта не было.

Сьведкамі, чаму так атрымалася, былі сябры ТБШ. Некаторыя настаўнікі, відаць, забыліся пра «выключнае права бацькоў», але затое правільна зразумелі палітыку прэзідэнта. Яны разышліся па дзіцячых садках, у якіх адкрываліся першыя класы, і на бацькоўскіх сходах прапанавалі бацькам «ещё раз хорошенько подумать и определиться» наконт мовы навучаньня дзяцей. Каб не псаваць адносіны з настаўнікамі, ад якіх можа залежаць лёс вучняў, людзі перапісалі заявы з беларускай мовы на расейскую. Пасьля, у размове з сябрамі ТБШ, некаторыя абураліся, але прасілі нідзе ня згадваць іх прозьвішчы, каб не пашкодзіць дзецям. У канцы XX стагоддзя зноў пачалі баяцца вучыць дзяцей на роднай мове!

Сітуацыя, якая склалася ў СШ N 18, - не выключэньне. У ТБШ ёсьць дадзеныя, што заявы ад бацькоў на беларускую мову навучаньня былі ў СШ N 11 і ў школе-гімназіі N 30. Але беларускіх класаў там няма. Калі беларусу адмаўляюць у праве вучыцца на роднай мове ў Беларусі, дзе яшчэ ён можа гэта зрабіць?

Дз.КІСЕЛЬ.

«ШЧЭ НЕ ВМЭРЛА УКРАІНА!»

Напрыканцы жніўня ў Харкаве адбыўся III Міжнародны кангрэс украіністаў. Форум прысьвячаўся праблемам украіназнаўства ў галінах гісторыі, права, паліталогіі, сацыяльнага і дэмаграфічнага разьвіцьця, літаратуразнаўства і мовы, украінскай дыяспары, укладу ўкраінцаў у сусьветную культуру. Па запрашэньні арганізатараў кангрэсу удзел у ім узялі вядомыя беларускія гісторыкі Анатоль Грыцкевіч і Дзьмітры Караў. Прафесар Гарадзенскага універсітэту і кіраўнік Заходнебеларускага Цэнтру дасьледаваньняў Усходняй Эўропы сп.Караў, у прыватнасьці, выступіў з дакладам «Беларуская і ўкраінская гістарыяграфія 2-й пал.XIX - пач.XX ст. (У пошуках нацыянальнага «Я»)».

Прэзідэнтам Міжнароднай Асацыяцыі Украіністаў на другі тэрмін абраны акадэмік Нацыянальнай Акадэміі навук Украіны Яраслаў Ісаевіч, які, дарэчы, зьяўляецца адным з чатырох ганаровых дактароў Гарадзенскага універсітэту.

Вітаўт РУДНІК.

НОВАЯ ЦАРКВА

У нядзелю 8 верасьня ў праваслаўнай парафіі на Беласточчыне ў Няёнтыках на новых могілках адбылося асьвячэньне падмуркавага каменя на будоўлі новай царквы. На ўрачыстасьць быў запрошаны мітрапаліт Варшаўскі і Польскі Васіль.

ПАМЯТАЮЦЬ СВАІХ ГЕРОЯЎ

На мінулым тыдні ў Беластоку, перад касьцёлам Сьвятога Казімера, адбылося адкрыцьцё помніка, прысьвечанага барацьбе прафсаюзаў «Салідарнасьць» за дэмакратыю і незалежнасьць Польшчы. Ва ўрачыстасьці прынялі ўдзел лідар «Салідарнасьці» М.Кшаклеўскі і былы Прэзідэнт Л.Валенса. Перад гэтым яны ўсклалі кветкі да помніка ксяндзу Ежы Папялушку, забітаму польскай дзяржбясьпекай у часы агоніі камуністычнага рэжыму.

С.С.

КАНФЕРЭНЦЫЯ НУМІЗМАТАЎ

У Супрасьлі каля Беластока прайшла канферэнцыя нумізматаў, у якой прынялі ўдзел больш чым 70 аматараў з чатырох краін, у тым ліку з Беларусі.

У КРАЙ КРЫЖАЦКІХ ЗАМКАЎ

Пасьля добрага адпачынку распачала новы навучальны год група дзяцей з Дзятлава. Па запрашэньні ксяндза Бернарда Каліноўскага з польскага мястэчка Гуткова яны адпачывалі ў летніку ў Новым Каўкове пад Ольштынам. Адпачынак юных дзятлаўчан стаў магчымым дзякуючы нямецкім фундатарам.

Андрэй ГАЎРЫЛЮК, Ольштын.

ЎЧАРА, СЁНЬНЯ, ЗАЎТРА

КАЛЯНДАР

14 верасьня

1884 г. У Наваградку нарадзіўся Фабіян Абрантовіч, беларускі каталіцкі духоўнік, доктар філасофіі, магістр тэалогіі.

1906 г. У Вільні выйшла газета «Наша доля» (90 гадоў таму) - першае беларускае перыядычнае выданьне.

15 верасьня

1830 г. Адкрылася Гарадзенская публічная бібліятэка.

1954 г. Памёр Язэп Драздовіч, славуты мастак-вандроўнік, этнограф, скульптар.

17 верасьня

1590 г. Горад Ліда атрымаў права на валоданьне гербам.

1939 г. Адбылося далучэньне Заходняй Беларусі да СССР.

18 верасьня



1807 г. Памёр Франьцішак Смуглевіч, знакаміты жывапісец, графік. Працаваў у Віленскім універсітэце, выконваў шматлікія размалёўкі храмаў на Беларусі.

19 верасьня

1797 г. У Горадні нарадзіўся Януарый Сухадольскі, вядомы жывапісец-баталіст, удзельнік вызвольнага чыну 1830-31 гг.

20 верасьня

1896 г. У Любчы нарадзіўся Мікола Дучыц (100 гадоў таму), вядомы мастак.

1903 г. Нарадзілася Натальля Арсеньнева, славутая беларуская паэтка, аўтарка слоў гімну «Магутны Божа». На пачатку 20-х гадоў жыла ў Слоніме.

Падрыхтаваў Ул.ХІЛЬМАНОВІЧ.

© PDF: Kamunikat.org 2013

© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2013

© PDF: Kamunikat.org 2013
© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2013

С П О Р Т

А КОНЮХУ НЕ ПАШАНЦАВАЛА...

Літаральна размазалі на дыване сваіх супернікаў з харвацкага Загрэба ў першай сустрэчы Кубку Эўропы гарадзенскія барцы грэка-рымскага стылю.



Каманда алімпійскага чэмпіёна 1984 году Улада Ліськяка саступіла гарадзенцам з лікам 1:9 і ў хатняй сустрэчы 21 верасьня толькі цудам можа перайсьці нашым атлетам дарогу.

Поўную перавагу гарадзенцаў яскрава адлюстроўваюць лічбы. Уладзімір Уласаў перамагае свайго харвацкага візаві 4:0. Прызёру Алімпіяды-96 Аляксандру Паўлаву хапіла 3 хвіліны 28 секунд, каб арбітры зафіксавалі яго перамогу над Жэлька Бутаравічам - 12:0. Барысу Радкевічу спатрэбілася яшчэ менш часу - 2.43 - і 10:0. Аляксандру Сільвінскаму прыйшлося змагацца ўсе 5 адведзеных на паядынак хвілінаў. Але і тут перавага гарадзенца ня выклікала сумненьня -5:0. Толькі ў пятым паядынку хварвацкі барэц змог набраць ачко. Але наш Эдуард Аплевіч зарабіў 9 балаў! Затым Аляксандр Ліра «чыста» перамагае чарговага небараку-харвата - 12:2. Усяго 1 хвіліна 45 секунд чарговага паядынку - і табло фіксуе перамогу Валеры Ціленьця - 10:0. Інтрыга чакалася ў вазе да 90 кг. Нашаму Аляксандру Сідарэнку супрацьстаіць... наш Валеры Грыдзюшка, гарадзенец, чэмпіён СССР, які выступае за харватаў. Але і тут 5:0 на карысьць гарадзенскага «класіка». У катэгорыі да 100 кг Анатолю Федарэнку супрацьстаіць яшчэ адзін беларус-легіянер, Генадзь Лісун з Гомеля. 2.32 - і «чыстая» перамога Федарэнкі. Перад апошнім, 10-м боем лік 9:0 на карысьць Горадні. Праходзіць паўтары хвіліны двубою – і наш супервагавік Дзьмітры Конюх вядзе 3:0. «Перамога ў кішэні!» - падумалі заўзятары і, напэўна, сам Конюх. За пасіўнасьць арбітры ставяць яго ў партэр і лік ужо 3:2. За дваццаць(!) секунд да канца двубою – тая ж гісторыя. Прыёмам на апошніх секундах перамогу 4:3 вырывае харват. Агульны лік - 9:1 на карысьць Горадні і гледачы, якія вяла рэагавалі на «Элегант-шоў» студыі «Сябры» з яго цемнаскурым салістам і даўганогай мулаткай-танцоркай, выбухаюць авацыямі. У Харватыі дастаткова будзе атрымаць адну (!) перамогу з перавагай у 2 ачкі, і можна рыхтавацца да сустрэчы з Масквой, якая яўна «заламае» Рым.

Вітаўт РУДНІК.
Фота Я.ВАНЮКЕВІЧА.

СВАІХ - «ГАМ», А ЧУЖЫМ - «ДАМ»

Па такім прынцыпе правялі апошнія гульні футбалісты другаліговага «Кардан Флаерс». У першы дзень восені каманда ў Слоніме перамагла 1:0 мясцовы «Камунальнік», якому гэтая параза можа каштаваць месца ў І лізе. У мінулую ж пятніцу на сваім полі гарадзенцы саступілі 1:2 не хапаючаму зорак «Кобрыну». Нестабільная гульня каманды выкліканая тым, што ўвосень другі круг чэмпіянату «карданы» ня могуць адначасова выпусьціць на поле сваіх лідараўветэранаў. Вось і ў мінулым туры: толькі зьявіўся пасьля 5-матчавай дысквалiфікацыі Сяргей Кароза, як на «заслужаны адпачынак» пасьля чырвонай карткі ў Слоніме адправіўся Юры Мазурчык...

* * *

Слонімскі «Камунальнік» сапраўды «паплыў» — на гэты раз параза ў Віцебску ад «Лакаматыва» — 1:2. У першай лізе адбыўся дваццаты тур. Гарадзенскі «Нёман» «зачапіў» першае ачко ў другім крузе (1:1 у Менску з «Атакай-Аўрай»). Лідзкі «Абутнік» ізноў саступіў — 1:2 «Белшыне» у Бабруйску.

Вітаўт РУДНІК.

"Дело Македонова" у Смаленску

У гэтым годзе другім выданьнем у Смаленску выйшла кніга Мікалая Ількевіча «Дело Македонова» з гісторыі рэпрэсій супраць Смаленскай пісьменьніцкай арганізацыі ў 1937-1938 гг. Чаму менавіта нам яна можа быць цікавай? Найперш, аўтар кнігі - наш зямляк з Горадні, а па-другое - у яго было шмат публікацый у перыядычным друку, зьвязаных з рэпрэсіямі проціў беларускіх пісьменьнікаў, імжа рыхтуецца кніга па «делу» Максіма Гарэцкага.

«Дело» Македонова» належыць да ліку тых нешматлікіх выданьняў у Расеі (а ў Беларусі падобных наогул не было), дзе архіў прадстаўлены цалкам, дакладней, цалкам з матэрыялаў «дела», якія датычаць справы А.В.Македонава, аднаго з самых блізкіх сяброў маладога А.Твардоўскага. Ужо толькі гэта ўяўляе сабой самастойную навуковую каштоўнасьць для гісторыкаў, палітолагаў, літаратуразнаўцаў: ёсьць магчымасьць як бы з сярэдзіны пабачыць і зразумець механізмы арганізацыі, а дакладней - фальсіфікацыі палітычных працэсаў, якія праводзіліся ў трыццатыя гады. Цікава і тое, што, валодаючы вялікай колькасьцю матэрыялаў, М.Ількевіч дакладна, трапна і ў той жа час зразумела і дасьціпна каментуе эпізод за эпізодам, што робіць кніжку даступнай шырокаму колу чытачоў. Дзеля таго, каб хоць трохі ўявіць эпоху, аб якой піша аўтар, прапаноўваю толькі адну цытату з абвінаваўчага заключэньня «дела»: «...в 1930 году МАКЕДОНОВ выступил с контрреволюционной оценкой пролетарского гимна «Интернационал» и вел клеветнические разговоры, направленные против вождей партии...»

І яшчэ адна акалічнасьць у адносінах да кнігі і яе аўтара. Мікалай Ількевіч зьяўляецца супрацоўнікам Федэральнай Службы Бясьпекі РФ. З гэтае нагоды цікава: ці знойдзецца ў беларускім КДБ калі хоць адзін супрацоўнік, які на такім матэрыяле напіша нешта падобнае. Павінны ж быць такія людзі, дый «дел», відавочна, не бракуе. Праўда?

М.МІКАЛАЙЧЫК.

СТАЛІНСКІЯ АХВЯРЫ Ў ПОЛЬШЧЫ

У суботу, 7 верасьня, Беластоцкая Камісія рассьледаваньня злачынстваў супраць польскага народу пачала эксгумацыю чалавечых рэшткаў у лесе каля Ольманту. Па папярэдніх зьвестках, гэта трупы байцоў Арміі Краёвай, расстраляных увосень 1946 году ворганамі дзяржбясьпекі камуністычнага ўраду Польшчы. Зьвесткі пра масавыя катаваньні ў гэтым месцы былі вядомыя ўжо пяцьдзесят гадоў.

С.С.

МНОГІЯ ЛЕТЫ !

11 верасьня гэтага году Алесю Мікалаевічу Белакозу з Гудзевічаў споўнілася 68 гадоў. Праз усё сваё сьвядомае жыцьцё Алесь Мікалаевіч з незвычайным патрыятызмам і бязьмежнай грамадзянскай мужнасьцю заўсёды актыўна бароніць незалежнасьць роднае Бацькаўшчыны, вельмі шмат шчыруе на глебе нашага нацыянальнага Адраджэньня. Ён зусім справядліва заслугоўвае таго, каб гэтая значная вяха ў яго жыцьці была адзначана «ПАГОНЯЙ» Ад сябе асабіста прапаную наступны вершык:

ГУДЗЕВІЦКІ ВОЛАТ

Ёсьць чалавек на Божым белым сьвеце,
Пазнаць якога лёгка па адной прыкмеце:
Да мозгу касьцей Беларус ён увесь,
Белакоз - прозьвішча мае, а імя - Алесь.

Бліз паўвека рупліўца плённа, чынна
Шчыруе на асьветніцкай ніве Айчыны.
Некалі ў школе, цяпер у музеі
Дапаможа ў любой разабрацца падзеі.

Гэты музей стаў цудоўнай крыніцай,
Што гоіць духоўна, калі ёй наталіцца.
Ад бяспамяцтва лечыць, ад бязродзтва,
Ад усякага іншага людзкога уродзтва.

Шэсьдзесят восем табе ў гэтым годзе -
Віншаваньне прымай па такой вось нагодзе!
Здароўя, шчасьця табе, даўгалецьця
Нам на радасьць, Радзіме, жонцы, унукам, дзецям!

Алесь ЛЯСКОЎСКІ, в.Сугакі.
«ПАГОНЯ» далучаецца да віншаваньня.

СПАРТЫЎНЫ КАЛЕЙДАСКОП

Інфармацыйныя агенцтвы ўнесьлі значную блытаніну ў турнірныя шляхі беларускай хакейнай зборнай. Удакладняем, што на самой справе супернікамі нашай нацыянальнай дружыны ў фінальным кваліфікацыйным адборы да Алімпіяды стануць нарвежцы і аўстрыйцы. Яшчэ адзін прэтэндэнт выявіцца ў сьнежні. У нашую групу могуць патрапіць хакеісты Казахстану (найбольшая верагоднасьць), Польшчы ці Вялікабрытаніі. Расклад для нашых уяўляецца досыць персьпектыўным. Квартэт «В» зьбярэцца 6 лютага ў Інсбруку. Галоўная праблема - ці здолеюць беларусы сабраць у гэты час мацнейшых легіянераў.

А ў Наваполацку прайшоў другі этап Кубку «Крыніцы». Нязьменны яго ўладальнік - гарадзенскі «Нёман» - застаўся верным традыцыі і на гэты раз. Сьпярша чэмпіёны УЭХЛ адолелі рыжскі "Юніёрс" – 5:1, потым менскае «Юнацтва» – 4:3, пасьля з такім жа лікам саступілі сталічнаму «Цівалі». А ў вырашальным матчы гарадзенцы прайгралі гаспадарам 1:2, але па лепшай розьніцы першынствавалі.

Заўважым, што рыжане і «Цівалі» выступалі па-за конкурсам (з таго, што ня здолелі прыехаць на першы этап).

Спроба баскетбольнага «Гродна-93» трапіць у Кубак Корача правалілася з трэскам. Вінаватая ў тым беларуская федэрацыя, ня выплаціўшая FIBA 10 тысячаў нямецкіх марак штрафаў за старыя «грахі» менскага РТІ і зборнай. Такім чынам, айчынныя клубы апынуліся перад зачыненымі дзьвярыма ў эўракубкі-96/97.

Тым часам сталі вядомы контуры нацыянальнага чэмпіянату - ён стартуе 29 верасьня. Да актэту мінулагодніх спаборнікаў далучыцца клуб з Барысава. Гарадзенскія баскетбалісты працягваюць падрыхтоўку. Застанецца, хутчэй за ўсё, у чэмпіёнскім складзе цэнтравы Павел Грыгор'еў. А вось яшчэ адзін гулец «асновы» - Алег Гладкі - пакуль ня вызначыўся.

Хельмут КАМЕНСКІ.

К Р Ы М І Н А Л

7 верасьня ў міліцыю зьвярнуўся жыхар горада Мурманска. Каля першай гадзіны ўначы на чыгуначным вакзале ён пазнаёміўся з двума хлопцамі. Пасьля расьпіцьця сьпіртных напояў яны паехалі на таксі на прасьпект Я.Купалы. Там яго зьбілі, забралі 500 даляраў, унутраны і замежны пашпарты.

8 верасьня ў 23.50 на двары аднаго з жыхароў вёскі Перасельцы Гарадзенскага раёну была выяўлена разабраная туша лася, які быў забіты днём у лясным масіве паблізу ад вёскі. Канфіскаваныя скура, галава лася, дзве паляўнічыя стрэльбы, абрэз.

У ноч на 9 верасьня з гаража па завулку Перамогі ў Горадні пасьля разбору сілікатных блокаў у сьцяне зьдзейсьнены крадзеж аўтамашыны «Мэрсэдэс 250» 1985 г. выпуску.

С.С.

НЕЗВЫЧАЙНЫЯ ПОМНІКІ

ГЭТА ЦІКАВА

У Рыме ёсьць адзіны ў сьвеце помнік аслу. Гісторыя яго зьвязана з І сусьветнай вайной. Гэтая цярплівая жывёліна была адзіным надзейным «транспартным сродкам» у італьянскай арміі.

Унікальны помнік устаноўлены ў аўстралійскім горадзе Бунарга. Ён узьведзены на сродкі фермераў у гонар вусеняў, якія ўратавалі горад ад зарасьнікаў кактусаў, супраць якіх былі бездапаможныя нават трактары і карчавальнікі.

Калі камандуючы арміяй, якая ў сярэднія стагоддзі аблажыла нямецкі горад Мюнстэр, убачыў на гарадзкой сьцяне пеўня, то зьмеркаваў, што яго намер узяць горад морам праваліўся, і зьняў аблогу. На самрэчы ж да таго часу ў горадзе не засталося ніякіх харчоў, і гэты певень быў апошняй «ежай». Удзячныя жыхары паставілі пеўню помнік.

На грэцкім востраве Родас ў даўнія часы разьвялася незьлічоная колькасьць ядавітых зьмей. Нехта прапанаваў завезьці туды аленяў, якія сваімі вострымі капытамі ў літаральным сэньсе слова растапталі зьмей. Удзячныя астраўляне паставілі помнік аленям.

Шмат стагоддзяў назад у нямецкім горадзе Люнебурге гараджане заўважылі, што кожны дзень сьвіньня рыецца ў адным і тым жа месцы. Раскапаўшы зямлю, яны знайшлі каменную соль. Жыхары паставілі гэтай сьвіньні помнік.

Ёсьць помнік голубу-паштавіку ў Англіі. Так увекавечана памяць галубкі, якая выратавала жыцьцё экіпажу падводнай лодкі ў час II сусьветнай вайны.

У цэнтры вёскі Куляшоўка Сумскай вобласьці стаіць помнік маманту. Ён складаецца з трох абсечаных чыгунных пірамідаў. На пастаменьце -рэльефнае адлюстраваньне маманта, а зьверху надпіс: «На гэтым месцы ў 1839 годзе выкапаны касьцяк перадпатопнага маманта».

А на чыгуначнай станцыі Сібуя (Токіа) стаіць бронзавы помнік сабаку Хачыка. Ён на працягу 10 год штодня прыходзіў сюды і цярпліва чакаў свайго гаспадара, якога ўжо не было ў жывых.

Падрыхтаваў Ю.ШАСТАК.

ГАРАСКОП НА ТЫДЗЕНЬ

БАРАН (21.3-20.4) Вяшчуецца Табе імклівы тыдзень. Насуперак шалёнаму тэмпу захоўвай усьмешку на твары, асабліва 13.09. Гэтым зыскаеш сабе сімпатыю вельмі ўплывовага Казярога.

БЫК (21.4-20.5) За выняткам пятніцы, удалыя дні. Зьведаеш прызнаньне шэфа, выканаўшы вельмі важную справу. Магчымы аванс. У суботу зрабі планы на апошні квартал.

БЛІЗЬНЯТЫ (21.5-21.6) З панядзелку посьпехі ў працы. Набірайся сілаў на канец тыдня і руш на заваёву сьвята. Апрача вытворчых посьпехаў таксама шчасьце ў пачуцьцях. Для самотных - пара на жаніцьбу.

РАК (22.6-22.7) Заняты працаю па вушы, нават не заўважыш, што траціш сяброў. Пастарайся гэта выправіць і запрасі іх на нядзельны абед. Грошы дазволяць зрабіць шляхетны прыём. Добрае здароўе.

ЛЕЎ (23.7-23.8) Ты ў сваёй стыхіі. Венера знаходзіцца ў Тваім знаку і вяшчуе любоўныя раманы. На працы абяцае флірт з Стральцом. Паспрабуй шчасьця ў латарэі.

ДЗЕВА (24.8-23.9) Ізноў Меркуры ў Тваім знаку, спадзявайся на посьпехі ў справах, усё будзе паляпша́цца. У планах разьлічвай на дапамогу сябра з-пад знаку Барана.

ШАЛІ (24.9-23.10) Мяркуецца рамантычны тыдзень. Дай волю пачуцьцям, асабліва пад канец тыдня. Не забывайся на час і на грошы. Пасьля 13.09 - сяброўствы і знаёмствы.

СКАРПІЁН (24.10-22.11) Добрыя дні для амбітных Скарпіёнаў. У працы яшчэ перад выходнымі адкрыюцца магчымасьці для зьдзяйсьненьня задум. Помні: шанцуе сьмелым. Можаш разьлічваць на Быка.

СТРАЛЕЦ (23.11-21.12) Поўныя шчасьця дні. Асабліва бурная будзе субота, калі Ты застанешся з каханым. Затое ў працы зоры раяць быць разважлівым. Сьпех не ідзе ў мех.

КАЗЯРОГ (22.12-20.1) З панядзелку зноў будзе добра спорыцца. На працы чакай посьпехаў, узмацні там сваё становішча. У выходныя дні набірайся сілаў.

ВАДАЛЕЙ (21.1-19.2) Дні зьменлівых пачуцьцяў. Не спрачайся з шэфам, асабліва 13.09. Помні, што можаш спакойна завершыць тыдзень. Шпацыр на сьвежым паветры палепшыць Тваё адчуваньне.

РЫБЫ (20.2-20.3) Шчасьлівы тыдзень, за выняткам пятніцы, калі можаш істотна пасварыцца з каханым. Але сам прызнаешся, што захацеў «зоркі з неба». Трацейскім суддзём выбяры каго-колечы з-пад знаку Скарпіёна.

ПАГОНЯ
ГРАМАДЗКА-ПАЛІТЫЧНАЯ ГАЗЕТА
Заснавальнік: культурна-асьветніцкі фонд «Бацькаўшчына»
Рэгістрацыйны нумар 597
Падпісны індэкс 63124

Адрас рэдакцыі:
230023, г.Горадня, вул. Дамініканская,1
(0152) 72-35-61, 72-29-96
E-mail: andrei@pagonia.belpak.grodno.by
FREESPACE BBS 0152-72-37-14 (23.00-10.00)

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць асабістую адказнасьць за падбор і дакладнасьць фактаў, іх меркаваньні не абавязкова адлюстроўваюць погляд рэдакцыі.
Адказнасьць за зьмест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.
Гарадзенская абласная ўзбуйнёная друкарня:
230023, г.Горадня, вул. Паліграфістаў, 4
Заказ 3075 Наклад 11642
Нумар падпісаны да друку ў 16.00, 05.09.96

Рэдактар Мікола Маркевіч

© PDF: Kamunikat.org 2013
© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2013